

ХТО ЯЗЫК ДОЎГІ МАЕ, БЕЗ ГРОШАЙ БЫВАЕ 5

НА ІГОЛКУ МОЖНА СЕСЦІ. І МОЖНА ЗЛЕЗЦІ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 ЧЭРВЕНЯ 2020 г. СЕРАДА № 106 (29220)

## ЦЫТАТА ДНЯ




**Валерый САДОХА, дырэктар Нацыянальнага цэнтра маркетынгу Міністэрства замежных спраў:**

*«На тавары харчовай групы, якія Беларусь вырабляе ў вялікай колькасці, попыт захаваецца, бо ў асобных рэгіёнах пандэмія прывядзе да памяншэння сельскагаспадарчай вытворчасці. Пасля ажыўлення сусветнай транспартнай сістэмы павысіцца попыт і на беларускія нафтапрадукты. Улічваючы, што ў Беларусі практычна ўсе прадпрыемствы не спынялі сваю работу, краіна не адчуе тых выдаткаў, якія панясуць іншыя дзяржавы ў час аднаўлення вытворчасцяў, прыпыненых на перыяд каранціну. У сувязі з гэтым айчынная прадукцыя будзе больш канкурэнтаздольная».*

# Свістулька «на кані»



Супрацоўнікі Бешанковіцкага Дома рамёстваў падрыхтавалі дасье на сапраўдны рарытэт свайго рэгіёна — старажытную гліняную цацку-свістульку, каб надаць ёй статус нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці Беларусі. У мястэчку над Дзвіной у майстроў спрадвеку былі свае фірменныя пластычныя стылі свістулек у форме чалавечка, вершніка, баранчыка — нават у раскопках такія знаходзілі.

— Каб наша цацка прайшла навуковую экспертызу, мы павінны захаваць асаблівасці формы і традыцыйны спосаб яе вырабу, — кажа майстар і дырэктар установы Алеся Аўчыннікава. — Бо акрамя нашага раёна, на наданне ахоўнага статусу падзвінскім і падняпроўскім свістулькам пададуць заявы Віцебскі, Дубровенскі, Лёзненскі, Сенненскі і Полацкі дамы рамёстваў.

На гэтым фота — майстар па лепцы, маляванні і абпальванні свістулек Алеся АЎЧЫННІКАВА *(злева)* і майстар-метадыст Аксана ЛЕЙЧАНКА з «наваспечанымі» бешанковіцкімі вершнікамі.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Дзяржава будзе кампенсаваць бацькам дзяцей-інвалідаў палову мытных пошлін пры ўвозе легкавых аўто.**
- У Беларусі выпусцілі новы гістарычны атлас.
- **Фота рарытэтаў Нацыянальнага гістарычнага музея ўпрыгожылі агароджу мінскага парку Чалюскінцаў.**



- Расія дазволіла ўезд беларускім вахтавікам.
- **Плошча, занятая баршчэўнікам Сасноўскага ў Мінску, з 2011 года скарацілася амаль у 9 разоў.**
- Трэціну сельгасзямель у Беларусі складаюць меліяраваныя.
- **Ва Ушачах сёлета плануюць адкрыць новую школу мастацтваў.**

ISSN 1990 - 763X

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ ЎБЯСПЕЦЫ!

# Калі вада — бяда

### Як адпачыць без рызыкі для жыцця?

**Абстаноўка з надвор'ем пакуль не вельмі спрыяе адпачынку каля вады. Яно і нядзіўна — доўгі час тэмпература паветра не ўздымаецца вышэй за 20 градусаў, да гэтага дадаюцца частыя дажджы і прахалодныя ночы. Але ж так будзе не ўсё лета. Ужо ў канцы гэтага тыдня слупок тэрмометра нарэшце пераадолее дваццаціградусную адзнаку. А гэта значыць, што да вадаёмаў масава пацягнуцца адпачывальнікі.**

— У Мінскай вобласці вызначаны 105 зон адпачынку, — паведаміў **старшыня Мінскай абласной арганізацыі Таварыства ратавання на вадзе Сяргей ПАТРЫКЕЕЎ.** — Перад адкрыццём купальнага сезона іх ужо праверылі вадалазы — на дне не павінна ляжаць патэнцыйна небяспечных для купальшчыкаў прадметаў. Дзе спатрэбілася, добраўпарадкавалі і берагавую тэрыторыю, паставіўшы навесы, біятуалеты, кабінкі для пераадзявання. СТАР. 11



Размова па сутнасці

**Андрэй ХУДЫК:**

# «Неабходна мабілізацыя ўсіх узроўняў улады, грамадства і бізнесу для сумесных дзеянняў па ахове прыроды»

Напярэдадні Дня аховы навакольнага асяроддзя міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Худык расказаў, для чаго патрэбны экалагічны рэйтынг развіцця рэгіёнаў, ці можна ў Беларусі выкарыстоўваць энергію нетраў і якія «зялёныя» кірункі становяцца нацыянальным прыярытэтам. СТАР. 8



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе
Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «Прадпрыемства павінна працаваць, прыносіць прыбытак»

## Першы этап вытворчасці камбікармоў на БНБК будзе запушчаны ўжо сёлета

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па арганізацыі высокатэхналагічнай аграпрамысловай вытворчасці поўнага цыклу. Экспартаарыентаваны і імпартазамяшчальны інвестыцыйны праект рэалізуе Беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя, першае ў Беларусі падобнае прадпрыемства.**

Па значнасці для краіны Аляксандр Лукашэнка паставіў гэта прадпрыемства на адзін узровень з будаўніцтвам атамнай станцыі, першы блок якой мы ў найбліжэйшы час запускаем, са стварэннем высокадакладнай зброі, з касмічнымі праектамі. «Гэта звязана з высокімі тэхналогіямі. ***<u>Гэта будучыня. Дадайце да гэтага яшчэ IT-парк і лічбавізацыю нашай краіны — не толькі эканомікі. Гэта будучыня нашай дзяржавы — як і любой іншай</u>***», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён пацікавіўся ходам будаўніцтва прадпрыемства: на якім этапе знаходзіцца, якія пытанні патрабуюць вырашэння, якія перспектывы на найбліжэйшы час. «Ні ў якім разе нельга выйсці за рамкі планавaных тэрмінаў. ***<u>Трэба прадпрыемства пабудаваць своечасова, бо яно павінна працаваць, прыносіць прыбытак</u>***, — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка. — Грошы, якія мы пазычалі, натуральна, трэба будзе паступова вяртаць».

Праект ажыццяўляецца сумесна з Кітайскай Народнай Рэспублікай паводле дамоўленасці кіраўнікоў Беларусі і Кітая. Мэта праекта «Арганізацыя высокатэхналагічнай аграпрамысловай вытворчасці поўнага цыкла на 2016—2032 гады» — укараненне глыбокай перапрацоўкі збожжа па сучасных метадах біятэхналогіі з атрыманнем незаменных амінакіслот для вытворчасці і выхаду на мясцовы і экспартны рынкі высокапрадукцыйных, збалансаваных камбікармоў і прэміксаў. Праект рэалізуецца ў Пухавіцкім раёне, генеральны падрадчык — кітайская інжынірынгавая кампанія.

Указ Прэзідэнта аб арганізацыі высокатэхналагічнай аграпрамысловай вытворчасці поўнага цыкла № 300 падпісаны 8 жніўня 2016 года.

**Варвара МАРОЗАВА.**

• У тэму

## ПРАЕКТ НА МІЛЬЯРД

**Аляксандр Лукашэнка даручыў паскорыць падрыхтоўку рашэнняў аб выдзяленні дадатковых сродкаў. Пра гэта паведаміў журналістам намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый Бельскі.**

«Ёсць усе падставы меркаваць, што ў найбліжэйшы час будзе запушчаны першы этап вытворчасці камбікармоў. Налета з апераджэннем прыблізна на восем месяцаў — другі этап, непасрэдна амінакіслот. Далей карпарацыя прыступае да рэалізацыі трэцяй чаргі праекта, новага этапу будаўніцтва», — сказаў Валерый Бельскі.

Для будаўніцтва ў Пухавіцкім раёне выдзяляецца зямельны ўчастак. На поўную магутнасць у адпаведнасці з Указам № 300 вытворчасць выйдзе ў наступным годзе.

Як праінфармаваў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, выручка ў найбліжэйшыя гады складзе прыкладна мільярд долараў. На праект выдзяляецца каля 630 мільёнаў долараў, са спадарожнымі інфраструктурамі — каля 700 мільёнаў. Трэцяя чарга будзе каштаваць прыблізна 500 мільёнаў долараў. Аляксандр Лукашэнка прынцыпова ўхваліў яе план.

Не менш за сорак працэнтаў прадукцыі другой чаргі праекта будзе экспартавацца. Дагэтуль Беларусь не выраблялa амінакіслот, неабходных, перш за ўсё, для развіцця свінагадоўлі і птушкагадоўлі. БНБК закупляе лізінг наўпрост з Кітаю танней, чым на сумежных рынках, сама меней на 400 долараў за тону. Высокатэхналагічная вытворчасць дазволіць замясціць гэты імпарт і пастаўляць амінакіслоты на экспарт.

Да новай для краіны галіны прыцягваюцца навуковыя, вучэбныя арганізацыі. Кадры рыхтуюцца загадзя. Ужо сёння каля трохсот чалавек атрымалі прапановы аб працаўладкаванні. Сярэдні заробак на вытворчасці прадугледжваецца каля пяці тысяч рублёў. Для супрацоўнікаў будуецца жыллё, паведаміў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

# «Ні ў якім выпадку нельга перашкаджаць людзям жыць»

## Прэзідэнт і старшыня Мінгарвыканкама абмеркавалі надзённыя пытанні жыцця беларускай сталіцы

**Прымаючы з дакладам Анатоля Сівака, Аляксандр Лукашэнка найперш закрануў пытанні горадабудаўніцтва. У прыватнасці, кіраўнік дзяржавы згадаў пра ўзвядзенне шматфункцыянальнага комплексу «Мінск-Мір». Асноўнай інвестыцыйнай пляцоўцы ў горадзе Аляксандр Лукашэнка ўдзяляе самую пільную ўвагу: «Як мне дакладваюць, здаецца, усё там схоплена, усё ідзе ў графіку і гэтак далей. Больш за ўсё мяне хвалюе будаўніцтва грамадскіх будынкаў: фінансавага цэнтра, гандлёва-забаўляльнага цэнтра — такіх, якія сёння не прадасі і хуткія грошы не атрымаеш. *<u>Жыллё — гэта ясна, жыллё добрае будуюць, малайцы, але трэба ж займацца і астатнімі аб'ектамі</u>*». Асабліва Прэзідэнта цікавяць інфраструктура, выкананне тэрмінаў будаўніцтва.**

У размове кіраўніка дзяржавы з мэрам была закранутая ўся гарадская інфраструктура. Анатоль Сівак праінфармаваў, што сёння ў рабоце 33 аб'екты аховы здароўя і адукацыі. «Канкрэтна дзесяць бальніц і паліклінік. Нядаўна мы ўводзілі корпус 5-й бальніцы, цяпер на выхадзе корпус анкалагічнага дыспансера, у сур'ёзнай рабоце 9-я бальніца. На выхадзе таксама школа ў Каменнай Горцы», — расказаў потым журналістам старшыня гарвыканкама.

### Новы погляд на інфекцыі

У парадак дня ўвайшло і пытанне, якое ўжо падымалася, — будаўніцтва шматфункцыянальнай клінічнай бальніцы. «Што будзем рабіць: будаваць, не будаваць? Можа быць, перафармаціруем нейк увогуле сістэму аховы здароўя, каб не будаваць? Зразумела, што сёння не пабудуем, сёння не да гэтага. Тым не менш перспектыву мусім бачыць», — разважае Прэзідэнт.

Як нагадаў журналістам Анатоль Сівак, да 2013 года вялися праектныя работы па будаўніцтве клінічнай бальніцы на 1250 месцаў на Даўгінаўскім тракце.

«На Крапоткіна ёсць інфекцыйная бальніца, яна дастаткова старая. Калі сутыкнуліся з гэтай бядой, з каранавірусам, мы ўбачылі, што ў чыстым выглядзе хворага з інфекцыяй, як правіла, няма. Гэта чалавек, у якога ёсць ці сардэчна-сасудзістыя праблемы, ці, мабыць, нейкія хірургічныя, ці анкалагічныя праблемы. І яго завезці ў інфекцыйную бальніцу, дзе профіль — толькі інфекцыя, складана... Нам трэба такую бальніцу сучасную пабудаваць, якая, калі спатрэбіцца, можа ў цэлым пераходзіць на профіль інфіцыраваных», — растлумачыў кіраўнік горада. Прэзідэнт ухваліў далейшую прапрацоўку гэтага праекта.

### Наш Арбат

Зайшла размова і пра размяшчэнне Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі ў межах вуліц Карла Маркса—Камсамольскай—Кірава.

«Што мы будзем рабіць з будынкам Гістарычнага музея — будзем новы будынак у перспектыве будаваць, ці гэты рамантаваць, ці пашыраць? Гэта ініцыятыва гарвыканкама, я гатовы да абмеркавання», — прапанаваў Аляксандр Лукашэнка.

Анатоль Сівак звярнуў увагу журналістаў, што вуліца Карла Маркса ў будучым набудзе статус пешаходнай.

«Калі гэты квартал (Карла Маркса, Леніна, Кірава, Камсамольская. — **«Зв.»**) паступова, спакойна развіваць пад тэматыку Гістарычнага музея, мы атрымаем добрую гарадскую турыстычную зону, да якой зручна дабірацца, дзе можна прагульвацца, мець набор кавярняў, рэстаранаў. На тым жа стадыёне «Дынама» сёння неэфектыўна эксплуатуецца стаянка для аўтамабіляў... Такім чынам, атрымліваецца пэўная зона прыцягнення. Але ёсць тыя, хто кажа: давайце будаваць новы музей. А ёсць старшыня Мінгарвыканкама, які кажа: давайце ўсё ж такі развіваць тое, што ёсць», — растлумачыў журналістам погляды бакоў Анатоль Сівак. Прэзідэнт падтрымаў яго пазіцыю.

Нагадаем, што перадпраектная дакументацыя па аб'екце «Будынак Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі ў Мінску» распрацавана інстытутам «Белдзяржпраект» па замове УКБ Мінгарвыканкама і ўзгоднена летась у чэрвені з улікам павелічэння агульнай плошчы будынка з 12 да 19 тысяч квадратных метраў у сувязі з неабходнасцю стварэння месцаў захоўвання экспазіцый музея.

У адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы Мінгарвыканкаму неабходна было распрацаваць у 2018—2019 гадах перадпраектную і праектную дакументацыю па будаўніцтве Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі па праспекце Пераможцаў, прадугледзеўшы выкарыстанне яго фасада ў якасці тэле- і кінаэкрана.

Вядучыя архітэктары Мінска канстатавалі, што новы будынак музея будзе дамінаваць над архітэктурна-скульптурным комплексам «Мінск — горад-герой» і будынкам Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Пры памяншэнні вышыні праектаванага будынка на 7—12 метраў, як рэкамендуе архітэктурная грамадскасць, яго функцыянальны складнік для размяшчэння музея становіцца неактуальным.

Беручы пад увагу сціснутыя ўмовы для размяшчэння музея па праспекце Пераможцаў і адсутнасць узгодненага варыянта размяшчэння мультымедыйнага экрана на фасадзе будынка музея, у снежні 2019 года распрацоўку будаўнічага праекта па аб'екце прыпынілі (гатоўнасць праектнай дакументацыі складала 78 працэнтаў).

Разглядзеўшы альтэрнатыўныя варыянты размяшчэння Гістарычнага музея, Мінгарвыканкам для забеспячэння максімальнай турыстычнай прывабнасці прапануе размясціць Нацыянальны гістарычны музей у будынках забудовы, якая склалася ў межах вуліц Карла Маркса—Камсамольскай—Кірава са стварэннем комплексу «Квартал музеяў» шляхам рэканструкцыі і рэстаўрацыі адміністрацыйна-гаспадарчых будынкаў агульнай плошчай амаль 32 тысячы «квадратаў».

### Каб быў поўны парадак

Вядома, кіраўнік краіны пацікавіўся, як старшыня гарвыканкама бачыць сітуацыю ў горадзе ў цэлым.

«***<u>Я чакаю ад цябе і праваахоўнікаў поўнага парадку ў горадзе-героі Мінску. Ні ў якім выпадку нельга перашкаджаць людзям жыць</u>***. Я так вось гляджу на іх: чысценькі, прыбраны, утульны, зручны, прыгожы горадок, можна і з дзеткамі недзе прагуляцца, і на веладарожцы пракаціцца, і на лыжаролерную трасу схадзіць, і спортам займайся — не хачу... Але вось жа карціць камусьці», — звярнуў увагу беларускі лідар.

Патрабаванні, каб у горадзе быў парадак, у гутарцы з журналістамі Анатоль Сівак назваў натуральнымі. Гэта першачарговая задача кіраўніцтва Мінска. «Сітуацыя знаходзіцца пад нашым жорсткім кантролем, і далей будзе кантралявацца, і будуць прымацца меры, рашэнні, каб не дапусціць парушэнняў заканадаўства. У нас ёсць зоны, дзе можна шумець, гаварыць, ёсць рашэнне гарвыканкама, якое для гэтага сёння адводзіць адмысловыя месцы, — калі ласка. Але парушаць агульны парадак у горадзе — гэта няправільна», — упэўнены старшыня Мінгарвыканкама.

### Трэцяя лінія — хутка

Анатоль Сівак таксама паведаміў журналістам, што будаўніча-мантажныя работы на трэцяй лініі Мінскага метрапалітэна будуць завершаны да 3 ліпеня. «Застаецца няўпэўненасць у частцы адкрыцця, таму што на гэтай лініі выкарыстоўваюцца новыя рашэнні. Такія элементы патрабуюць узмоцненай абкаткі і наладкі. Гэтым займаюцца замежныя падрадчыкі, графік работы якіх у гэты перыяд залежыць ад эпідэміялагічнай сітуацыі», — растлумачыў кіраўнік горада.

Сярод новаўвядзенняў ён назваў дзверы, якія ўстанаўліваюцца на пероне і павінны быць сінхранізаваныя з дзвярамі рухомага саставу, новы рухомы састаў, які праходзіць абкатку, і спецыяльную сістэму кіравання.

Анатоль Сівак дадаў, што ўсе праблемы з пастаўкамі для выканання будмантажу вырашаныя.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Прыёмная кампанія — 2020

# Адшліфаваць веды... анлайн

## У абітурыентаў з'явілася магчымасць яшчэ раз адрэпеціраваць будучае ЦТ

**З 4 і 8 чэрвеня на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў дадаткова стануць даступныя для праходжання ў рэжыме анлайн варыянты рэпетыцыйнага тэсціравання другога і першага этапаў адпаведна.**

Арганізатары тлумачаць: калі абітурыент удзельнічаў у першым і (або) другім этапе бланачнага рэпетыцыйнага тэсціравання (яны праходзілі афлайн з кастрычніка да красавіка), у іх будзе магчымасць выбраць той варыянт тэсту, які на адпаведным этапе рэпетыцыйнага тэсціравання яны не выконвалі.

Кошт удзелу ў рэпетыцыйным тэсціраванні складае сем рублёў за адну дысцыпліну. Калі ў асабістым кабінеце абітурыента на сайце РІКВ ёсць свабодныя аплаты, якія ўтварыліся ў выніку адмены сеансаў бланачнага рэпетыцыйнага тэсціравання, іх можна выкарыстаць для аплаты тэсціравання ў рэжыме on-line. У такім выпадку дадатковай аплаты не патрабуецца.

Таксама арганізатары ЦТ яшчэ раз растлумачылі, як абітурыентам цяпер вызначыцца з датай праходжання іспытаў па рускай мове і матэматыцы. Гэта самыя масавыя дысцыпліны на ЦТ, таму ўпершыню, у сувязі з напружанай эпідэміялагічнай абстаноўкай, для іх здачы зарэзерваваны два дні, а абітурыенты падзелены на два патокі.

Калі пропуск на прадмет «Руская мова» быў выдадзены на 15 чэрвеня, у пункт тэсціравання трэба прыйсці 26 чэрвеня (27 чэрвеня абітурыент ужо не будзе дапушчаны да праходжання ЦТ). Калі ў пропуску пазначана дата ЦТ па прадмеце «Руская мова» 27 чэрвеня, то абітурыент павінен з'явіцца ў пункт тэсціравання менавіта 27 чэрвеня (26 чэрвеня ён не зможа здаць ЦТ). Па матэматыцы абітурыенты, у якіх у пропуску пазначана дата 19 чэрвеня, здаюць ЦТ 1 ліпеня, а ў каго пазначана 2 ліпеня, здаюць тэст 2 ліпеня.

Абітурыентам, якія ў ходзе рэгістрацыі на ЦТ атрымалі пропускі да зацвярджэння новага графіка правядзення цэнтралізаванага тэсціравання, абменьваць іх не спатрэбіцца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Добрыя навіны

# ПРЫГАЖОСЦЬ У ДАПАМОГУ ВЫХАВАЦЕЛЯМ

## Новы дзіцячы садок у курортнай зоне і наваселле шматдзетнай сям'і ў катэджы

**Свята з музыкай, падарункамі і віншаваннямі адбылося ў пасёлку Чонкі Гомельскага раёна. Маленькіх наведвальнікаў тут сустрэў новы дзіцячы яслі-сад. Ва ўрачыстай цырымоніі яго адкрыцця ўзяў удзел старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь Салавей.**



Дзіцячы яслі-сад «Вясёлка-град».

«Вясёлка-град» — такую назву атрымаў новы садок. Ім стаў былы корпус дзіцячага аздараўленчага лагера «Чонкаўскі бор». Рашэнне пра рэканструкцыю было прынята два гады таму.

На тэрыторыі Чонкаўскага сельсавета жыве амаль 470 дашкалят, а праектная магутнасць ужо існуючага садка — толькі 64 месцы. Пры гэтым ён перапоўнены: там цяпер 127 юных грамадзян. Многім бацькам даводзіцца адвозіць малых у садкі Гомеля. Між тым пасёлак вельмі актыўна развіваецца. Штогод будуюцца новыя жылыя дамы, у прыватнасці, сёлета таксама распачнецца новая забудова. Таму падобны сацыяльна значны аб'ект безумоўна быў неабходны.

— За дзевяць месяцаў рэканструявалі і цалкам перапланавалі будынак пад садок: пакоі для груп, асобныя спальныя пакоі, спартыўная зала, сумешчаная з музычнай, невялікая колькасць службовых памяшканняў, — тлумачыць **начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Гомельскага райвыканкама Алена КАВАЛЁВА.** — Вельмі актыўна ўключыліся спонсары — гандлёвыя прадпрыемствы раёна, якія набылі спартыўнае абсталяванне, горкі, сэнсарныя дарожкі, сухі басейн, дыванова пакрыцці... Адмысловае штучнае пакрыццё хутка з'явіцца і ў спартыўнай зоне ў двары.

Пакуль новы садок вядзе набор двух- і трохгадовых выхаванцаў. Старэйшыя дзеткі наведваюць існуючую дашкольную ўстанову, аднак яна перапоўнена, сведчыць суразмоўніца:

— Новы садок часткова вырашае праблему, але для развіцця дашкольнай адукацыі месцаў усё роўна яшчэ не хапае: больш за 150 дзяцей наведваюць садкі ў абласным цэнтры.

На будаўніцтва «Вясёлка-града» выдаткавалі 1,5 мільёна рублёў. На цырымоніі адкрыцця дашкольная ўстанова атрымала сертыфікат ад Гомельскага аблвыканкама на набыццё аўтобуса, ад райвыканкама — на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

— Чонкі можна назваць горадамспадарожнікам абласнога цэнтра, — адзначыў **старшыня аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.** — Вядома, пасёлак яшчэ будзе развівацца, спатрэбяцца і дзіцячыя садкі. Таму ўжо цяпер разглядаецца пытанне аб рэканструкцыі яшчэ двух карпусоў гэтага аздараўленчага лагера пад дашкольную ўстанову на 130 месцаў. Варта ўлічваць той факт, што тэрыторыя аздараўленчага лагера размешчана ў надзвычай прыгожай прыроднай зоне і дзеці штодзень змогуць знаходзіцца на свежым паветры.

Кіраўнік абласной вертыкалі ўлады таксама паведаміў журналістам, што сёлета на Гомельшчыне плануецца ўвесці ў эксплуатацыю яшчэ 12 сацыяльна значных аб'ектаў. Сярод іх школа ў мікрараёне № 21, два басейны, паліклініка па вуліцы Мазурава ў Гомелі. У Мазыры адкрыецца драматычны тэатр, будуецца дзіцячы садок. Таксама вядзецца рэканструкцыя аб'ектаў аховы здароўя: бальніц у Добрушы і Хойніках, Гомельскай абласной туберкулёзнай бальніцы.

**Між тым у Гомелі вялікая сям'я Наталлі Радчанка — маці-выхавацеля шасцярых дзяцей — засялілася ў новы двухпавярховы катэдж. Гэта сёмы дом сямейнага тыпу для дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, што з'явіўся ў Савецкім раёне абласнога цэнтра.**

— У мяне трое сваіх дзяцей і шасцёра дзяцей, народжаных сэрцам, — расказвае пра сваю сям'ю Наталля Радчанка. — Сярод прыёмных дзяцей пяцігадовыя хлопчыкі-блізняты, дзве дзяўчынкі і двое хлопцаў, якія цяпер адпачываюць у санаторыі.

У шматдзетнай маці двое родных дарослых дзяцей і сын, якому дзесяць гадоў. Таксама яна мае пяць унукаў.

— Мне прапанавалі стаць мацівыхавацелем для большай колькасці дзяцей, чым у мяне было дагэтуль, — дадае Наталля. — І я згадзілася.

Жанчына ўдзячная ўсім, хто падарыў ёй дружнай шумнай вялікай камандзе магчымасць жыць у новым утульным доме. Жыллё абсталявана ўсім неабходным — ад бытавой тэхнікі да мэблі. У хлопцаў і дзяўчат асобныя вялікія пакоі. У двары змясцілася гульнявая пляцоўка.

Дапамогу ў аснашчэнні дома мэбляй, бытавой тэхнікай і іншымі карыснымі рэчамі аказала звыш дзесяці прадпрыемстваў, што знаходзяцца на тэрыторыі Савецкага раёна Гомеля. Акрамя таго, да пераезду сям'і ў новае жыллё тэрыторыю вакол новага дома прывялі ў парадак. Так, калектыў аддзела адукацыі, спорту і турызму адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля, актывісты раённай арганізацыі РГА «Белая Русь», а таксама работнікі ААТ «Кірмаш» правялі суботнік па азеляненні двара, высадзілі 30 дрэў, пладова-ягадных і дэкаратыўных кустоў.

— У перспектыве тут будзе квітнеючы сад. Дзеці, калі будуць расці ў ім, сярод прыгожых кветак, не толькі атрымаюць станоўчыя эмоцыі, але і навучацца берагчы прыгажосць, ствараць яе сваімі рукамі, — упэўнены шэфы дома сямейнага тыпу.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

# Важны груз

**У аўторак у Нацыянальны аэрапорт Мінск прыбыў самалёт Міністэрства абароны з каштоўным грузам з Паднябеснай. Іл-76 даставіў у Беларусь гуманітарную дапамогу вагой 22 тоны.**



Фота БелТА.

У яе складзе — сродкі медыцынскага прызначэння. Сярод іх сто кіслародных канцэнтратараў. Пра гэта расказаў намеснік міністра аховы здароўя Барыс Андрасюк. Падобны апарат здольны выдзяляць з навакольнага паветра малекулы кіслароду, канцэнтраваць іх і выдаваць плынь чыстага дыхальнага газу. Канцэнтратары выкарыстоўваюцца падчас кіслароднай тэрапіі. У адрозненне ад апаратаў са сціснутым кіслародам, іх эксплуатацыя таннейшая. Груз суправаджалі прадстаўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях на чале з намеснікам міністра Анатолем Даўгалеўцам. Гуманітарную дапамогу размяркуюць па ўсіх рэгіёнах краіны.

Прадстаўнік Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі доктар Рашэд Мустафа Сарвар адзначыў, што канцэнтратары былі закуплены арганізацыяй сумесна з кампаніяй Wargaming. Таксама ён падзякаваў ураду Беларусі за дастаўку грузу. Зазначым, што гэта ўжо чацвёрты падобны рэйс з Кітая.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

На слыху

# Праз 21 дзень — не заразныя

## Унесены змяненні ў тэсціраванне хворых з лёгкімі і бессімптомнымі формамі COVID-19

**Міністэрства аховы здароўя змяніла правілы тэсціравання пацыентаў з лёгкімі і бессімптомнымі формамі COVID-19. Дапоўнены падыходы да лячэння сярэдняцяжкіх і цяжкіх формаў інфекцыі, а таксама прапісаны крытэрыі пастаноўкі дыягназу. Гэта прадугледжвае адпаведны загад ведамства № 557 ад 21 мая. Апублікаваны каментарыі да яго, якія тлумачаць навраўвядзенні.**

Цяпер пацыентам з лёгкімі формамі, якія не маюць каранавіруснай пнеўманіі, на 14-я суткі робяць экспрэс-тэст на антыцелы. Калі ён адмоўны, бальнічны закрываюць. Калі тэст станоўчы, бальнічны закрываюць на 21-ы дзень з моманту кантакту з інфіцыраваным. Раней у такіх выпадках паўторны тэст рабілі на 10-ы дзень, а пры станоўчым выніку паўтаралі яго кожныя пяць дзён да атрымання адмоўнага.

Міністэрства аховы здароўя растлумачыла, што ПЦР-дыягностыка дазваляе выявіць фрагменты РНК-віруса, але гэта не сведчыць, што ён жыццяздольны. Часткі віруса могуць прысутнічаць у арганізме, але чалавек не заразны для навакольных.

У здаровага чалавека ў норме не павінна выяўляцца РНК-каранавіруса. Адпаведна, калі першасна ў пацыента вызначаецца РНК (з праявай сімптомаў ці без іх), гэта сведчыць пра інфіцыраванне. Але практыка паказвае, што ў большай часткі пацыентаў рэшткі РНК-віруса пры ПЦР-дыягностыцы могуць выдзяляцца больш за месяц. Вопыт кітайскіх і іншых вучоных сведчыць, што гэта нежыццяздольны вірус, не здольны кагосьці інфіцыраваць.

Даследаванні паказваюць, што выдзеліць і атрымаць жыццяздольны вірус удавалася максімум на 12-ы дзень ад моманту праяўлення клінічных сімптомаў.

— У літаратуры не апісана выпадкаў інфіцыравання пацыентаў праз 21 дзень ад моманту клінічных праяў пры лёгкіх формах захворвання, а таксама не даказана, што яго носьбіцтва сведчыць пра здольнасць заражаць. Пры гэтым абломкі віруса могуць утрымлівацца ў клетцы яшчэ дастаткова доўга, але жыццяздольны вірус, які можа заражаць, не выдзяляецца, — растлумачылі ў міністэрстве змяненні ў дыягностыцы.

Таму вырашана не падвяргаць пацыентаў лішні раз працэдуры забору мазка, які не мае клінічнага значэння.

**Такім чынам, пацыентам з лёгкай і бессімптомнай формамі пры адмоўным мазку на 14-я суткі закрываюць бальнічны. Калі мазок станоўчы, то бальнічны закрываюць на 21-ы дзень ад моманту меркаванага кантакту.**

*Па звестках на 2 чэрвеня, у Беларусі выяўлена 44 255 чалавек са станоўчым тэстам на COVID-19. З іх папраавіліся і выпісаны 19 195 пацыентаў, памерла 243 чалавекі. Усяго праведзена 562 945 тэстаў. За апошнія суткі прырост новых інфіцыраваных склаў 852 выпадкі, 419 пацыентаў папраавіліся, тры памерлі.*

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Дональд Трамп збіраецца разгарнуць войскі ў гарадах



Улады ЗША гатовыя задзейнічаць войскі для аднаўлення парадку ў тых штатах, дзе адбыліся пагромы. Пра гэта падчас свайго звароту да нацыі заявіў прэзідэнт Дональд Трамп, перадае агенцтва Reuters. Як вядома, апошні тыдзень Злучаныя Штаты ахоплены масавымі беспарадкамі, шматтысячныя пратэсты выклікала гібель афраамерыканца ад рук паліцыі. Між тым сталі вядомыя вынікі ўскрыцця цела Джорджа Флойда. Эксперты паведамілі, што ён памёр ад спынення дыхання, прычына — сціскане шыі затрыманага, якое ўжыў паліцэйскі. У арганізме Флойда, як паведамляе ТАСС, спасылаючыся на заключэнне патолагаанатамаў, былі выяўлены сляды інтаксікацыі наркатычнымі рэчывамі.

### Іспанія ўводзіць мінімальны пражытачны даход

Савет міністраў Іспаніі ўхваліў праграму забеспячэння мінімальнага гарантаванага даходу найбольш малазабяспечаным грамадзянам. Як растлумачыла афіцыйны прадстаўнік урада Марыя Хесус Мантэрэ, гэты крок накіраваны «на зніжэнне ўзроўню беднасці, асабліва сярод сем'яў з дзецьмі». Пабла Іглесіяс, другі віцэ-прэм'ер і міністр па сацыяльных правах, абгрунтаваў рашэнне: «Пандэмія, што відавочна, пагоршыла сітуацыю для многіх нашых суайчыннікаў. Пражытачны мінімум фігураваў ва ўрадавай праграме, але ва ўмовах пандэміі гэта стала надзённай неабходнасцю, таму што тысячы іспанскіх сем'яў больш не могуць чакаць». Памер дапамогі будзе вар'іравацца ад 462 да 1015 еўра ў месяц; ім змогуць скарыстацца 850 тысяч сем'яў — каля 2,3 мільёна чалавек, сярод іх трацінa — непаўналетнія. Мінімальны жыццёвы даход налічваецца з 1 чэрвеня.

### У Кітаі знайшлі сям'ю вельмі рэдкіх гібонаў



За апошнія паўстагоддзя колькасць хайнаньскіх гібонаў катастрафічна знізілася. Сёння яны жывуць толькі ў невялікай палосцы лесу на кітайскім востраве Хайнань. У канцы 1950-х гадоў на востраве налічвалася каля дзвюх тысяч асобін гэтага прымата, а ўжо ў 1970-х іх заставалася толькі дзесяць. Дзякуючы праграме кансервацыі від спадзяюцца выратаваць: па падліках 2003-га ў лесе было ўжо каля 30 асобін. Хайнаньскі гібон — самы рэдкі прымат на планеце, але ёсць шанцы на тое, што від зможа перадолець крызіс і не вымерці. З гэтага пункту гледжання знаходка — добрая навіна.

# У ЗОНЕ ПАВЫШАНАЙ НЕБЯСПЕКІ

## Як працуе выбуховатэхнічны цэнтр унутраных войскаў МУС



**Раз-пораз па вуліцах населеных пунктаў праязджаюць грузавікі, на кузавы якіх нанесена чырвоная паласа з вялікімі літарамі «Размініраванне». Гэта — транспарт, якім карыстаюцца сапёрна-піратэхнічныя групы ўнутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў. Часцей за ўсё яны адпраўляюцца на выклікі, звязаныя з трыма падставамі — забытымі кімсьці рэчамі, паведамленнямі аб мініраванні аб'ектаў і небяспечнымі знаходкамі часоў мінулых войнаў, якія і дагэтуль падносіць нам зямля. Аператыўна-тэхнічны агляд месцаў масавых мерапрыемстваў таксама ўваходзіць у іх кампетэнцыю. Пра асаблівасці работы выбуховатэхнічнага цэнтра ўнутраных войскаў МУС мы гутарым з намеснікам начальніка ўстановы Максімам КУЛЕМ.**



— Зона нашай дзейнасці размежавана з тэрыторыяй адказнасці інжынерных войскаў Міністэрства абароны і рэгулюецца адпаведнай пастановай Савета Міністраў. Калі падсумаваць, то сапёрнымі работамі ў населеных пунктах займаемся мы. Адпаведна, усё, што ляжыць па-за іх межамі, — не наша поле дзеяння. Пры гэтым за апошнія 17 гадоў нашы спецыялісты абясшкодзілі амаль 36 тысяч выбуханебяспечных прадметаў. Лічыце, у сярэднім за кожны дзень — па 5-6 штук, — адзначае Максім Куль. — Год ад году колькасць знойдзеных намі і, адпаведна, знішчаных боепрыпасаў прыблізна аднолькавая. Але існуе прыкмета — калі зіма была снежная, то смяротна небяспечных знаходак будзе крыху больш. Як вада «выштурхоўвае» камяні на полі, так яна выносіць на паверхню і снарады.

Разам з тым было некалькі выпадкаў, калі задачы па праверцы тэрыторыі ставіліся менавіта ўнутраным войскам. Напрыклад, гэта адбывалася перад будаўніцтвам новай узлётна-пасадачнай паласы ў аэрапорце. А аднойчы праз пасёлак Ураджайны, што знаходзіцца ў прысталіччы, пранёсся ўраган, што паваліў шмат дрэў. Падчас расчысткі мясцовасці былі знойдзены боепрыпасы. Выклікалі нас, мы іх абясшкодзілі. А заадно праверылі навакольную тэрыторыю, каб перадаць яе мясцоваму лясгасу ў цалкам бяспечным стане.

**«Шраг трэніровак праводзіцца ў месцах масавага знаходжання людзей, на стадыёнах. Зразумела, складана правесці заняткі адразу на ўсім чыгуначным вакзале ці тэрыторыі аэрапорта — усё ж гэта аб'екты, якія функцыянуюць пастаянна, 24 гадзіны на суткі. Але гэта неабходна для агульнай бяспекі».**



У мінулыя гады перыядычна паступалі паведамленні аб тым, што падчас земляных работ на будоўлі быў знойдзены чарговы боепрыпас. Вось толькі часам гэта аказваецца не паўнавартасны снарад, а ўсяго толькі корпус ад яго. Датычыць гэта нямецкай зброі. Тут згадваецца гісторыя пра тое, як на адным з ваенных заводаў Германіі была арганізавана антыфашысцкая група, у якую ўваходзілі рускія, французы, чэхі і немцы. Яна і арганізавала сабатаж, лозунг якога гучаў наступным чынам: «Чым павольней працуеш, тым хутчэй надыдзе мір». Удзельнікі групы наўмысна псавалі складовыя часткі боепрыпасаў. Таму не выключана, што і ў нашы дні знаходзяцца такія «пасланні», якія, не выбухнуўшы, магчыма, выратавалі чыёсьці жыццё.

Гэтыя карпусы знішчаюцца падчас практычных заняткаў. Але калі снарад аказаўся сапраўдны, то падзеі адбываюцца па звыклым сцэнарыі — спачатку эвакуіруюцца людзі, пасля ачапляецца мясцовасць, зброю асцярожна грузяць у аўтамабіль і вывозяць на палігон.

***— Што рабіць, калі корпус бомбы ці снарада ў такім стане, што яго немагчыма перавезці ў бяспечнае месца?***

— З 2007 года, колькі я служу ва ўнутраных войсках, я не прыпомню такіх выпадкаў. За адным выключэннем. У пачатку гэтага года ў Баранавічах мужчына падарваўся на боепрыпасе падчас яго разбору. Наша сапёрна-піратэхнічная група знайшла яшчэ адну адзінку зброі. Аднак гэта было не рэха вайны — аказалася, што мужчына прынёс іх з палігона. На шчасце, памеры боепрыпаса і аддаленасць месца дзеяння ад пабудоў дазволілі знішчыць яго проста на месцы. І, шчыра кажучы, я не магу ўявіць, як знішчыць нетранспартабельную бомбу праз дарогу ад жылога квартала. Таму будзем спадзявацца, што да гэтага не дойдзе.

***— Ці даводзіцца працаваць з боепрыпасамі часоў Першай сусветнай?***

— Сапёрна-піратэхнічныя групы не раз выязджалі на іх ліквідацыю ў населеныя пункты Валожынскага і Баранавіцкага раёнаў. Радзей нас выклікаюць на Мядзельшчыну і Случчыну. У іншых мясцінах колькасць такіх даўніх боепрыпасаў знаходзіцца каля нуля. Справа ў тым, што праз гэтыя мясціны доўгі час праходзіла лінія фронту паміж рускай і нямецкай арміямі. І, што цікава, пераважная большасць нашых знаходак там — гэта снарады. У тыя часы іх вытворчасць яшчэ не была настолькі дасканалая, і таму далёка не ўсе стрэлы заканчваліся выбухамі. Разам з тым такія снарады і цяпер смяротна небяспечныя.

Што да мін, то нам даводзіцца абясшкоджваць часцей за ўсё мінамётныя. Супрацьтанкавыя і супрацьпяхотныя ўжо даўно з'яўляюцца рэдкімі знаходкамі. Справа ў тым, што пры пастаноўцы мінных палёў рабіліся карткі мясцовасці з прывязкай. Пасля разгрому Германіі Савецкі Саюз атрымаў гэтыя звесткі, і таму ачыстка мінных палёў прыйшлася на першыя пасляваенныя гады. Вельмі рэдка здараецца так, што адну-дзве міны своечасова не знайшлі, вось яны і «ўсплываюць» у нашы дні.

***— Ці даводзілася знаходзіць мірныя артэфакты ваеннага часу?***

— Нярэдка падчас сапёрных работ нам трапляюцца прадметы посуду, гадзіннікі, компасы. Калі рэч бяспечная, то яна ачышчаецца і перадаецца ў музей. Невялікая экспазіцыя створана ў нашым выбуховатэхнічным цэнтры, асобная працуе ў часці 5448 у пакоі баявой славы. Там жа ёсць і музей унутраных войскаў. Некаторыя знаходкі былі адпраўлены нават у музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

**«Існуе прыкмета — калі зіма была снежная, то смяротна небяспечных знаходак будзе крыху больш. Як вада «выштурхоўвае» камяні на полі, так яна выносіць на паверхню і снарады».**

***— У якой амуніцыі выбухатэхнік адпраўляецца на баявое заданне?***

— Добра сябе зарэкамендаваў выбуховаабарончы касцюм «Атлант-5». Ён можа вытрымаць падрыў выбуховага прыстасавання масай да ста грамаў. Таксама у нас ёсць бронекамізэлькі самага высокага класа абароны і проціасколкавыя шлемы. У перспектыве да іх можа далучыцца касцюм «Даспех», які лічыцца на цяперашні момант адным з найлепшых у свеце. Зараз вывучаецца неабходнасць яго набыцця. А сучасны мінашукальнік дазваляе знаходзіць аб'екты, зробленыя з канкрэтнага металу або сплаву. Гэта значыць, што ім можна карыстацца нават ва ўмовах моцнай засмечанасці тэрыторыі і на моцна мінералізаваных грунтах.



**Калі снарад аказаўся сапраўдны, то падзеі адбываюцца па звыклым сцэнарыі — спачатку эвакуіруюцца людзі, пасля ачапляецца мясцовасць, зброю асцярожна грузяць у аўтамабіль і вывозяць на палігон.**

***— На базе 2-й інжынернай брыгады ў пасёлку Сосны летась быў створаны супрацьмінны цэнтр Узброеных Сіл. Наколькі актыўнае ў вас супрацоўніцтва?***

— Супрацьмінны цэнтр каштоўны тым, што ў ім ёсць мноства макетаў, якія дапамагаюць нам у тэарэтычнай падрыхтоўцы. Палігонам мы карыстаемся сваім. Спецыяліст рыхтуецца прыблізна адзін месяц, яму выдаецца пасведчанне ўстаноўленага ўзору. А атрыманыя веды, як і паўсюль, замацоўваюцца на практыцы. У нашым выпадку — на канкрэтных выездах. Напрыклад, шраг трэніровак праводзіцца ў месцах масавага знаходжання людзей, на стадыёнах. Зразумела, складана правесці заняткі адразу на ўсім чыгуначным вакзале ці тэрыторыі аэрапорта — усё ж гэта аб'екты, якія функцыянуюць пастаянна, 24 гадзіны ў суткі. Але гэта неабходна для агульнай бяспекі. Так, мы некалькі разоў выязджалі па паведамленнях, у якіх гаварылася пра замініраваны борт. Ну а колькі разоў «мініравалі» чыгуначны вакзал, дык і злічыць цяжка. Практыка патрэбна, каб ведаць на баявым заданні, куды ісці і што рабіць.

Што да лжывых выклікаў, то немалая іх частка прыходзіцца на забытыя сумкі і пакеты. Але сапёры ўдзячны неабыякавым грамадзянам, якія паведамляюць пра кінутыя без нагляду рэчы. Пільнасць і неабыякавасць — гэта вельмі добрыя чалавечыя якасці.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**



Тэма

# Беражыце вашы грошы

## Што рабіць, каб не патрапіць на «вуду» інтэрнэт-злачынцаў?

**Высокія тэхналогіі, якія з кожным годам усё больш пранікаюць у наша жыццё, прыцягваюць і ўвагу злачынцаў. Сёлета за пяць месяцаў у гэтай сферы ўжо зафіксавана больш за тры тысячы парушэнняў закону. Прыкладна траціна з іх прыходзіцца на крадзяжы грошай з банкаўскіх плацежных картак. Падрабязней пра гэта расказалі спецыялісты ўпраўлення «К» Міністэрства ўнутраных спраў.**



Зламыснікі часцей за ўсё выкарыстоўваюць два метады. Першы з іх — гэта так званая сацыяльная інжынерыя. «Нацягнуўшы» на сябе маску вашага знаёмага (для чаго нярэдка могуць узломвацца і акаўнты ў сацыяльных сетках), у нейкі момант да вас у асабістыя паведамленні «стукаецца» зламыснік. Ён можа прыкінуцца, напрыклад, супрацоўнікам банкаўскай установы або пакупніком тавару, якому трэба перавесці грошы. Размова можа пачацца здалёк, але ў выніку перапіска звядзецца да таго, што ў вас папросяць звесткі з вашай пластыкавай карткі. Мэта пры гэтым будзе заяўлена высакародная — напрыклад, аддаць грошы, якія чалавек цяпер просіць пазычыць.

**Памятайце: нягледзячы на тое што ў Беларусі дзейнічае прынцып «нулявой адказнасці», банк мае права адмовіць вам у вяртанні грашовых сродкаў, калі вы самі перадалі зламысніку ўсе доступы да вашага рахунку. Таму гэта якраз той выпадак, калі ваша бяспека перш за ўсё ў вашых руках.**

— У выпадку калі вам пішуць з нагоды набыцця нейкага тавару, нядобразычлівы суразмоўца прапануе перавесці перадаплату за тавар на банкаўскую плацежную картку. Маўляў, зараз ён знаходзіцца за мяжой і так яму зручней. Прычым якраз тут ён кажа праўду: як правіла, зламыснікі, якія прававорочваюць такія справы, знаходзяцца па-за тэрыторыяй Беларусі. Далей яны просяць паведаміць нумар плацежнай карткі і тэрмін яе дзеяння. І вось гэта павінна стаць «чырвонай лініяй», за якую заходзіць нельга.

У ведамстве, аднак, канстатуюць, што ў абсалютнай большасці выпадкаў уладальнікі картак самі лёгка перадаюць іх рэквізіты сваім суразмоўцам. Больш за тое, яны нават паведамляюць змест SMS, якія прыходзяць ад банка на іх мабільныя тэлефоны, і іншую канфідэнцыяльную інфармацыю, якую мусіць ведаць выключна ўладальнік карткі. Яна прызначана для таго, каб спісваць грошы з рахунку. Гэта, напрыклад, трохзначны CVV-код, што размешчаны на адваротным баку пластыкавай карткі, сеансавыя паролі, код аўтарызацыі, пароль 3D-Secure. Ці пашпартныя звесткі.

— Другі распаўсюджаны метад выманьвання даных — фішынг. У перакладзе з англійскай мовы гэты тэрмін азначае «рыбалка». Вось толькі на кручок прасунуты «рыбак» падчэплівае занадта даверлівага чалавека. А ў такім выпадку метады фішынгу і сацыяльнай інжынерыі нярэдка камбінуюцца.

...У канцы мінулага года жыхарка Маладзечна вырашыла прадаць праз адну з гандлёвых пляцовак у сеціве тэлевізар. На сувязь з ёй у месенджары выйшаў адзін з меркаваных пакупнікоў. Ён пажадаў унесці колькі грошай у якасці перадаплаты, для гэтага папрасіў перадаць рэквізіты плацежнай карткі. Здавалася б, трывіяльная рэч для тых, хто нешта купляе праз інтэрнэт.

І вось цяпер пачынаецца самае цікавае. Праз колькі часу пакупнік зноў выходзіць на сувязь з гаспадыняй тэлевізара і паведамляе ёй пра тое, што, маўляў, транзакцыя з нейкай прычыны не прайшла. Пасля ён прапанаваў удакладніць, чаму гэта адбылося, непасрэдна ў банку. І даслаў ёй спасылку на сайт фінансавай установы.

Тут бы задацца пытаннем: чаму невядомы суразмоўца дасылае нейкія спасылкі, калі сайт банка адкрываецца па першым жа выніку запыту ў любым пошукавіку? Вось і аказалася, што пакупнік адправіў жанчыну на падроблены сайт. Мэта гэтай электроннай пляцоўкі ў адным: «выцягнуць» усе рэквізіты, неабходныя для праводзення аперацый на рахунку. Так у адзін момант небарака засталася без 20 тысяч долараў і 13 з паловай тысяч еўра.

Буйныя сумы грошай, якія вокамгненна «перацякаюць» у кішэню злачынцы, неадназова фігуруюць у падобных справах. У лютым гэтага года невядомы зламыснік займеў рэквізіты да пластыкавай карткі жыхара Мінска і скраў з карт-рахунку больш за 16 тысяч рублёў. Прыблізна такой жа сумы ў эквіваленце пазбавіўся і жыхар Рэчыцы — інтэрнэт-зламыснік «звёў» з яго карткі каля 7 тысяч беларускіх рублёў і 4 тысяч долараў ЗША.

Аднак інтэрнэт-злачынцаў цікавіць любая сума, якая ляжыць на вашым рахунку. Прыклад «наадварот» — калі махляром аказаўся не пакупнік, а прадавец. На адной з інтэрнэт-пляцовак ён размясціў аб'яву пра тое, што прадае дзіцячую каляску. На абвестку ў студзені гэтага года адгукнулася жыхарка сталіцы. Пачалася перапіска, падчас якой візаві пажадаў даведацца пра рэквізіты банкаўскай карткі пакупніцы. Хоць, здавалася б, навошта яму тыя звесткі? Гэта ж ён мусіць атрымаць грошы, а не яна. Але гэтая акалічнасць не насцярожыла жанчыну. Яна і выдала рэквізіты сваёй карткі, пасля чаго зламыснік перавёў з яе рахунку на свой суму прыкладна ў 800 рублёў.

— Схемы інтэрнэт-махлярства могуць быць вельмі разнастайныя. Гэта просьбы аб дабрачыннай фінансавай дапамозе, паведамленне пра выйгрыш у латарэю (у якой вы маглі і не ўдзельнічаць), прапановы дадатковага заробку. Часам яны выходзяць за межы выключна віртуальнай прасторы — вам можа пазваніць чалавек, які прадстаўляецца супрацоўнікам банка.

**«Схемы інтэрнэт-махлярства могуць быць вельмі разнастайныя. Гэта просьбы аб дабрачыннай фінансавай дапамозе, паведамленне пра выйгрыш у латарэю (у якой вы маглі і не ўдзельнічаць), прапановы дадатковага заробку. Часам яны выходзяць за межы выключна віртуальнай прасторы — вам можа пазваніць чалавек, які прадстаўляецца супрацоўнікам банка».**

Спецыялісты ўпраўлення «К» МУС раяць падчас падрыхтоўкі да праводзення плацежных аперацый у інтэрнэце звяртаць увагу на некаторыя моманты. Гэта, папершае, вельмі нізкая цана на прапанаваны тавар, заклікаючая прыцягнуць да сябе ўвагу. Але зноў жа, нельга сказаць, што кожны, хто хоча штосьці прадаць танней, абавязкова з'яўляецца махляром. А вось спробы любым шляхам атрымаць рэквізіты вашай банкаўскай карткі — ужо трывожны званочак. На многіх інтэрнэт-пляцоўках рэалізавана сістэма абароны ад віртуальнага махлярства: напрыклад, пакуль вы не пацвердзіце, што атрымалі тавар, грошы будуць заблакіраваны на транзітным рахунку. Злодзеі гэта ведаюць і таму імкнуцца працягнуць гутарку ў інтэрнэт-месенджары або праз электронную пошту. А пераход на любыя дасланыя вашым суразмоўцам спасылкі з высокай доляй імавернасці цягне за сабой пераадрасацыю на падроблены сайт.

— Лепш за ўсё аформіць асобную картку для пакупак анлайн і на выпадак выезду за мяжу. Пераводзіць туды грошы найлепш незадоўга да здзяйснення меркаванай транзакцыі. Што да картак, якія выкарыстоўваюцца ў Беларусі, то не будзе лішнім абмежаваць да іх доступ з іншых краін — такую магчымасць банкі даюць. Логін і пароль да інтэрнэт-банкінгу трэба ўводзіць толькі на ўласных смартфоне і камп'ютары, да якіх не маюць доступ пабочныя асобы. Лепш таксама ўсталяваць ліміт на максімальную суму грашовай аперацыі. Вельмі пажадана ўключыць двухфактарную аўтэнтыфікацыю і SMS-апавяшчэнне.

А што рабіць, калі невядомы тэлефануе і прадстаўляецца супрацоўнікам банка? Трэба ведаць, што банкаўскія супрацоўнікі не будуць запытваць у вас па тэлефоне асабісты нумар, пашпартныя звесткі і рэквізіты саміх картак. Але калі вы сутыкнуліся з такой сітуацыяй, то перателефануйце ў банк на нумар, указаны на афіцыйным сайце фінансавай установы.

І памятайце: нягледзячы на тое што ў Беларусі дзейнічае прынцып «нулявой адказнасці», банк мае права адмовіць вам у вяртанні грашовых сродкаў, калі вы самі перадалі зламысніку ўсе доступы да вашага рахунку. Таму гэта якраз той выпадак, калі ваша бяспека перш за ўсё ў вашых руках.

## Міліцыянер выратаваў бяздомнага

**Здарэнне адбылося ў Гродне 25 мая. Прапаршчык міліцыі Сяргей Піліпчык нёс службу па ахове Генеральнага консульства Польшчы. Раптам ён убачыў, што з аднаго з дамоў, размешчаных непадалёк, ідзе дым. Міліцыянер паведаміў пра ўбачанае ў дзяжурную часць і накіраваўся да месца пажару.**

— Дом гэты аказаўся зачынутым, — паведамілі ў Дэпартаменце аховы МУС. — Унутры яго Сяргей Піліпчык убачыў разведзенае вогнішча. Побач з ім спаў мужчына. Мяркуючы па знешнім выглядзе, там быў бяздомны. Полымя ўжо дайшло да матраца, на якім ляжаў чалавек, пачынала тлець і яго вопратка. Прапаршчык міліцыі выцягнуў небараку на свежае паветра і неадкладна выклікаў хуткую дапамогу.

Тое, што міліцыянер падаспеў на дапамогу, уратавала бяздомнаму жыццё. Медыкі дыягнаставалі нязначнасць апёкаў, аказалі першую дапамогу. Шпіталізацыя не спатрэбілася.

## Зайсці ў музей анлайн

**У маі гэтага года ўласны сайт займеў музей Міністэрства ўнутраных спраў. Віртуальная пляцоўка месціцца па адрасе: museum.mia.by.**

Цяпер наведаць экспазіцыю аддалена можна ў літаральным сэнсе гэтага слова. Справа ў тым, што на сайце музея рэалізавана магчымасць 3D-тура — вы можаце падарожнічаць па яго залах, седзячы перад экранам манітора. Асабліва гэта важна цяпер, калі з-за распаўсюджвання каранавіруса работа музеяў у нашай краіне часова прыпынена.

Фонд музея складаюць фотакопіі арыгіналаў дакументаў, архіўных фотаздымкаў, здымкі табельнай і канфіскаванай зброі, знакаў адрознення і ўзнагарод, асабістых рэчаў, рэчавых доказаў, службовай тэхнікі...

Сярод прадстаўленых выяў экспанатаў ёсць і вельмі цікавыя. Напрыклад, у раздзеле «Рэчавыя доказы» ёсць здымак фальшывага савецкага пашпарта, датаванага 1970 годам. Выдадзены ён на імя Луны Артура Аганесавіча. На тое, што пасведчанне асобы падробленае, паказваюць дзве рэчы. Па-першае, яго ўладальнік нібыта нарадзіўся ў горадзе Нікалаеве Хабараўскага краю, а такога населенага пункта ў тым рэгіёне ніколі не было. А па-другое, нацыянальнасць грамадзяніна Луны пазначана як «марсіянін».

А сярод асабістых рэчаў міліцыянераў увагу прыцягвае швейцарскі гадзіннік Paul Moser. Ён быў падораны работніку міліцыі Васілю Лазарэнку ў 1927 годзе з нагоды 10-годдзя ўтварэння праваахоўнага органа. На вечку гадзінніка — дароўны надпіс па-беларуску.

## Адпачынак без «прыгод»

**Нягледзячы на тое што гэтай вясной прырода мала радавала беларусаў добрым надвор'ем, у месцах адпачынку сёлета зарэгістравана ўжо больш за сто злачынстваў.**

— На жаль, адпачынак на беразе вадаёмаў для многіх людзей звязаны з распіццём алкагольных напояў ці піва, што ў зонах адпачынку і на пляжах катэгарычна забаронена, — адзначыў **намеснік начальніка арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС Сяргей ГАРОХАЎ. —** Гэта адміністрацыйнае правапарушэнне, якое цягне за сабой штраф у памеры да васьмі базавых велічынь. І між іншым такія выпадкі складаюць каля траціны ўсіх зарэгістраваных парушэнняў. Але купанне і спіртное несумяшчальныя — гэта адна з самых распаўсюджаных прычын гібелі на вадзе.

Таксама ў месцах адпачынку нярэдкія выпадкі выкрадання веласіпедаў, мабільных тэлефонаў, кашалькоў. Сярод іншых распаўсюджаных парушэнняў — паркоўка, купанне і разпаленне вогнішчаў у забароненых месцах. Напрыклад, аматарам пасмажыць шашлыкі на такой тэрыторыі давядзецца раскашэліцца на 12 базавых велічынь, а «несанкцыянаваным» купальшчыкам — на суму да трох.

— Сумесна з падраздзяленнямі МНС, Таварыства ратавання на водах і прыродаахоўнымі арганізацыямі плануецца праводзіць сістэматычныя рэйды, звяртаючы асаблівую ўвагу на месцы адпачынку, размешчаныя паблізу сталіцы і абласных цэнтраў, бо там канцэнтруецца найбольшая колькасць людзей, — дадаў Сяргей Гарохаў.

Матэрыялы паласы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** **г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| Продавец | **ОАО «СМТ № 8»,** **г. Минск, ул. Пионерская, 37** |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1**
Месторасположение:
**Гомельская обл., г. Гомель, ул. Добрушская, 91А и 91Д**

Производственная база в составе: **склад РМХ-20** (350/С-174808, 193,5 кв. м), **здание материального склада № 2** (350/С-56797, 478,6 кв. м), **здание административно-бытовое** (350/С-56799, 550,5 кв. м), **гараж** (350/С-56788, 675 кв. м), **склад по обогреву инертных материалов** (350/С-56798, 29,6 кв. м), **склад масел** (350/С-56822, 23,5 кв. м), **здание материального склада № 1** (350/С-56796, 1072,5 кв. м), **склад цемента** (350/С-56819, 33 кв. м), **проходная** (350/С-56823, 14,8 кв. м), **компрессорная** (350/С-56820, 62,6 кв. м), **котельная** (350/С-56800, 110 кв. м), **ограждение и бетон. площадка производ. базы** (350/С-204615, составные части: ограждения – ж/б – 468,1, 316,0 и 1214,5 кв. м, из металлической сетки – 11,5 кв. м, деревянное – 17,1 кв. м, металлическое – 4,8 кв. м, кирпичное – 4,3 кв. м; ворота, калитка, площадка бетон., покрытия).

***Сведения о земельном участке:*** предоставлены на праве постоянного пользования пл. **4,4874** га для эксплуатации и обслуживания администрат. и производственно-склад. помещений производ. базы и пл. **0,5576** га для эксплуатации и обслуживания зданий специализир. складов, торговых баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ. Обременения прав на зем. уч. 0,5576 га – охранные зоны линий связи и радиофикации, электрич. сетей, сетей и сооружений водоснабжения и канализации

***Обременения:*** площади здания материального склада № 2, бетонная площадка, склад масел, часть помещений гаража и здания материального склада № 1 сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 50 822,38 бел. руб.**
(снижена на 78 %)

**Лот № 2**
Месторасположение:
**Минск, пер. Софьи Ковалевской, д. 46, 46/1-46/3, 46/5, 46/6**

| Наименование | Об. пл., кв. м | Инвентарн. номер |
|---|---|---|
| **Склады** | 1193,9 | 500/С-28335 |
| **Здание административно-бытового корпуса** | 137,2 | 500/С-28334 |
| **Здание многофункциональное** | 4270,2 | 500/С-28468 |
| Составные части и принадлежности: дворовая территория, тротуар, подпорная стенка, бордюр, ограждение, эстакада, отстойник, заборы, ворота, площадки для складирования, подъездного пути грузового крана и для размещения сушильного оборудования | | |
| **Производственный цех** | 1 411,0 | 500/С-28339 |
| **Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель Ж1/К** | 357,3 | 500/С-51092 |
| **Здание котельной** | 65,1 | 500/С-51093 |
| Составные части и принадлежности: труба дымовая | | |
| **Ливневая канализационная сеть (внешнеплощадочная)** | 103,96 м. п. | 500/С-1008470 |
| **Ливневая канализационная сеть (внутриплощадочная) с очистным сооружением** | 271,39 м. п. | 500/С-1008471 |
| **Внеплощадочная водопроводная сеть** | 158,99 м. п. | 500/С-1008467 |
| **Внутриплощадочная водопроводная сеть** | 351,44 м. п. | 500/С-1008461 |
| **Хозяйственно-фекальная канализационная внутриплощадочная сеть** | 321,36 м. п. | 500/С-1008477 |
| **Тепловая сеть, сеть горячего водоснабжения** | 88,3 и 87,7 м. п. | 500/С-1008462 |

**Иное имущество,** входящее в состав лота: сети 0,4 КВ (инв. № 83), блоки гаражные 6,2*3,2 (3 шт. – инв. № 7, 70317, 70318), аспирационные установки (2 шт. – инв. № 238, 239, 80), шлагбаум (инв. № 1147), котлы водогрейные «Минск-1М» (2 шт. – инв. № 793, № 794), теплосчетчик ТЭМ-104-1 ДУ 100 (инв. № 795), теплообменник пластичный (инв. № 796), насосы ТР-300/2 (2 шт. – инв. № 797, № 798), насос ТРЕ 40-190/2 (инв. № 799), краны подвесные электрические однобал. (6 шт. – инв. № 94, 102, 41185, ГП2Т. – инв. № 101, 109, ГП1Т- инв. № 110); многолетние насаждения (инв. №№ 760–786, 7870, 7881)

**Сведения о земельных участках:**
- пл. **2,4498** га предоставлен на праве общего долевого постоянного пользования (доля: 9569/10000) для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений производ. базы ПМК-1. Ограничения (обременения) прав: водоохранные зоны водных объектов г. Минска, пл. 0,9124 га и 0,4420 га;
- пл. **0,4528** га предоставлен на праве временного долевого пользования (доля 1/2, срок действия по 31.05.2020) для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений (проезд). Ограничения (обременения) прав: водоохранные зоны водных объектов, охранные зоны сетей и сооружений водоснабжения и канализации

**Дополнительная информация:** в состав лота не входит оборудование трансформаторной подстанции ТП-2267 (ТМ 250/10), камеры силового оборудования РП-2267, хозфекальная канализационная внеплощадочная сеть (инв. № 500/С-1008466)

**Обременения:** площади частично сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона.

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 3 955 144,51 бел. руб.**
(снижена на 25 %)

**Задаток (лот № 1 – 10 %, лот № 2 – 1 %)** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещения о проведении предыдущих аукционов опубликованы в газете «Звязда»: лот № 1 – 14.05.2020, лот № 2 – 30.04.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона: 18.06.2020 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 16.06.2020 до 17.00** по указанному адресу

**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор аукциона:**
**ЗАО «Центр промышленной оценки»,**
**г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
**Продавец: ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Октябрьская, 16**
**Оператор ЭТП: ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46**

| | |
|---|---|
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**
**Местонахождение: г. Минск, ул. Октябрьская, 16**

| № лота | Наименование | Инв. № по бух. учету | Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Транспортные средства (б/у)** | | |
| 1 | **Автомобиль МАЗ 5516** (рег. знак КС 5596), д. в. 2000 | 17120116 | **7 728,00** |
| 2 | **Автомобиль УАЗ 3909** (рег.знак КМ 6442), д. в. 1997 | 17040038 | **1 260,00** |
| 3 | **Автопогрузчик 4081** | 17050350 | **2 520,00** |
| 4 | **Экскаватор ЭО-2621В-2 на базе ЮМЗ** | 17090013 | **4 116,00** |
| 5 | **Автомобиль GAZ-31105** (рег. знак 6848 КЕ), д. в. 2006 | 17180354 | **1 008,00** |
| | **Оборудование (б/у)** | | |
| 6 | **Вертикально-фрезерный станок 6Р13**, д. в. 1983 | 14650167 | **4 116,00** |
| 7 | **Координатно-расточной станок BKoZ**, д. в. 1970 | 14240044 | **10 836,00** |
| 8 | **Специальный высокоэффективный станок с ЧПУ (комплекс плазменной резки Vanad Proxima)**, д. в. 2008 | 13050672 | **109 200,00** |
| 9 | **Горизонтально-расточной станок 2Е656Р**, д. в. 1975 | 14260064 | **50 736,00** |
| 10 | **Вертикально-сверлильный станок 2118**, д. в. 1952 | 14230040 | **1 512,00** |
| 11 | **Горизонтально-фрезерный станок 6Р82Г**, д. в. 1978 | 14680033 | **2 016,00** |
| 12 | **Универсально-зубофрезерный станок 5К22П**, д. в. 1972 | 14510331 | **6 216,00** |
| 13 | **Круглошлифовальный универсальный станок 3М162В-01** (п/автомат), д. в. 1986 | 14310052 | **9 408,00** |
| 14 | **Вертикально-сверлильный станок ПК203**, д. в. 1990 | 14230904 | **1 512,00** |
| 15 | **Радиально-сверлильный станок 2А554**, д. в. 1988 | 14250692 | **19 152,00** |
| 16 | **Плоскошлифовальный станок 3Л722А**, д. в. 1990 | 14370441 | **31 668,00** |
| 17 | **Внутришлифовальный станок СИ 6АСХ500**, д. в. 1977 | 14310135 | **20 328,00** |
| 18 | **Зубошлифовальный универсальный станок 5В833** (п/автомат), д. в. 1977 | 14510288 | **10 080,00** |
| 19 | **Координатно-расточной станок 2Д450**, д. в. 1977 | 14240038 | **6 384,00** |
| 20 | **Универсальный плоскошлифовальный станок с горизонтальным шпинделем 3Е711В1**, д. в. 1987 | 14370226 | **5 712,00** |
| 21 | **Универсальный фрезерный станок FWF32J** | 14670106 | **5 796,00** |
| 22 | **Вертикальный консольный шпоночно-фрезерный станок 692Р**, д. в. 1984 | 14650121 | **3 948,00** |
| 23 | **Электрическая барабанная дробилка МСДБ-350-33** (для получения щепы из деревянных отходов) | 28550100 | **23 856,00** |

**Начальная цена снижена на 30 %**

| | |
|---|---|
| **Условия самовывоза и демонтажа** | Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводятся за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона |

Задаток **10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **4 %** для транспортных средств и **2 %** для оборудования от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в газета «Звязда» от 12.05.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов – 16.06.2020 в 11.00.** **Окончание торгов – 16.06.2020 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 15.06.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 422/С-58279 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание мясного павильона центрального рынка), площадью 161,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина, 22А. Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425850100002001238, площадью 0,3255 га (назначение – для обслуживания здания мясного павильона центрального рынка) по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина, 22А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0032 га

Начальная цена продажи – 17 500 руб. (семнадцать тысяч пятьсот рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 875 руб. (восемьсот семьдесят пять рублей)

**Продавец – Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26. Тел. (801514) 28-1-50**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209. Тел.: 55-87-70, 55-87-71**

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 08 июля 2020 г. в 10.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Пушкина, 26**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **https://grino.by/aukcion/**
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 18.09.2020 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 06 июля 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-71952 (назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – автозаправочная станция (АЗС № 2)), общей площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу Лидский р-н, Третьяковский с/с, 170, в р-не д. Островля с оборудованием: шкаф управления 1987 года выпуска; щиток ПР-9232-325. 1978 года выпуска; счетчик трехфазный СА4-И672М 2004 года выпуска, заводской № 0024897; счетчик трехфазный СА4Y-И672М 2004 года выпуска, заводской № 315854; счетчик трехфазный СА4-И699, 2004 года выпуска, заводской № 8089; счетчик трехфазный СА4Y-И672М, 1997 года выпуска, заводской № 45189; котельная топочная (котел Vaillant VKO35 с дизельной горелкой, водонагреватель VIN 120/5) 1997 года выпуска, заводской № 9722820117; система видеонаблюдения АГЗС № 5, 2019 год установки; охранно-пожарная сигнализация «Аларм-3» ППКО 063-2-3 1999 года выпуска, заводской № 01061011; охранно-пожарная сигнализация DSC PC500RC 2000 года выпуска; охранно-пожарная сигнализация АЗС № 5 Satel CA-4 2000 года выпуска; охранно-пожарная сигнализация АЗС № 2 DSC PC 510H 2000 года выпуска; кондиционер воздуха MITSUI MKS09HN4 2007 года выпуска,заводской № 05MI204738; кондиционер воздуха MITSUI MKS09HN4, 2007 года выпуска, заводской № 05MI204714

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 423685405630000034, площадью 1,6280 га (назначение – для строительства и обслуживания автомобильной заправочной станции), расположенном по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 170, в р-не д. Островля

Начальная цена продажи – 216 224,40 (двести шестнадцать тысяч двести двадцать четыре рубля сорок копеек) с учетом НДС

Сумма задатка – 21 622 руб. (двадцать одна тысяча шестьсот двадцать два рубля)

**Продавец – Открытое акционерное общество «Лиданефтепродукт», 231300, г. Лида, пр-т Победы, 127. Тел. 8-0154-522-606**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209. Тел. 55-87-70**

Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 07 июля 2020 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **https://grino.by/aukcion/**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 02 июля 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/**

## ЗАО «ЦЕНТР ПРОМЫШЛЕННОЙ ОЦЕНКИ» ИНФОРМИРУЕТ:

В извещение о проведении электронных торгов (30.06.2020) по продаже **нагульных прудов на р. Березина**, принадлежащих ЗАО «Молодечномебель», опубликованном в газете «Звязда» от 30.05.2020, вносится изменение: **начальную цену лота с НДС 20 % читать как: 120 000,00 бел. руб.** (снижена на 70 %)

**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (44) 704-92-06.**
**Сайт: www.ipmtorgi.by**

УНП 191021390

З нагоды

# ЧАС ПРЫРОДЫ

## Што для аховы біяразнастайнасці робіцца ў нашай краіне

**Біяразнастайнасць ахоплівае 8 мільёнаў відаў на планеце — ад раслін і жывёл да грыбоў і бактэрый, а таксама экасістэмы, у якіх яны знаходзяцца, і генетычную разнастайнасць у межах асобных відаў. У выніку чалавечай дзейнасці гэтае багацце можа знікнуць, закранўшы і самога чалавека, — бо, не клапоцячыся пра прыроду, мы не клапоцімся пра сябе. У нашай краіне гэта добра разумеюць.**



Фота Валерыя КАВАЛЁНКА.

— Натуральныя экасістэмы займаюць больш за палову тэрыторыі Беларусі, — расказаў **начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Мікалай СВІДЗІНСКІ.** — Іх плошча складае 11,7 мільёна гектараў, ці 56,4 % тэрыторыі краіны. Гэта лясы (75 % натуральных экасістэм), хмызнякі, натуральныя лугавыя тэрыторыі, балоты, водныя аб'екты (рэкі, азёры, сажалкі). Чакаецца, што ў выніку работы, якая будзе праводзіцца ў наступныя пяць гадоў, доля такіх зямель павялічыцца і складзе 58,5 % ад агульнай плошчы Беларусі.

У краіне працягваецца работа па наданні міжнароднага статусу асабліва ахоўным прыродным тэрыторыям. Створана трансгранічная ААПТ «Запаведнае Паазер'е», якая ўключае два нашы заказнікі — «Чырвоны Бор» і «Асвейскі», а таксама расійскі нацыянальны парк «Себежскі». Ёсць пэўныя планы па развіцці турызму на такіх тэрыторыях, пры гэтым важна вытрымліваць баланс паміж захаваннем прыроды і патрэбамі турыстаў.

Сёння дзеянні чалавека павінны быць накіраваны на памнажэнне прыродных багаццяў. Гэта не толькі беражлівае стаўленне да жывёльнага і расліннага свету, але і абарона ад інвазійных чужародных відаў раслін і дзікіх жывёл. У прыватнасці, Мінпрыроды актуалізавала пералік такіх відаў. Цяпер у гэты спіс уключаны чырвонавухая чарапаха, янотападобны сабака, норка амерыканская, сумнік гіганцкі, баршчэўнік Сасноўскага, рабінія лжэакацыя і іншыя. Яны наносяць сур'ёзную шкоду навакольнаму асяроддзю, абарыгенным відам раслін і жывёл, біялагічнай разнастайнасці.



Як паведаміў **генеральны дырэктар Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах Аляксандр ЧАЙКОЎСКІ,** створана сістэма маніторынгу чужародных відаў жывёл і раслін, устаноўлены асноўныя шляхі іх пранікнення, вызначаны найбольш уразлівыя да новых інвазій экасістэмы, сфарміраваны «чорны спіс» інвазійных відаў жывёл і раслін. Сёлета выйдзе ў свет другое, пашыранае выданне «Чорнай кнігі» інвазійных відаў жывёл Беларусі. У ім прадстаўлены звесткі пра пяць відаў паразітычных арганізмаў, шэсць відаў водных беспазваночных, 45 наземных беспазваночных, тры віды рыб, адзін від рэптылій і тры віды млекакормячых.

У нашай краіне вядзецца вялікая работа па аднаўленні папуляцый рэдкіх і знікаючых відаў жывёл. Напрыклад, у 2018 годзе былі адлоўлены асобіны кумжы звычайнай, што дазволіла забяспечыць закладку трох тысяч штук аплодненых ікрынак у інкубатары. Працягваецца фарміраванне лакальных папуляцый сцерлядзі ў басейнах рэк Дняпра і Прыпяці. Аднаўлены тры папуляцыі шыракапалага рака ў азёрах, дзе раней гэты від знік.

Вучонымі НПЦ па біярэсурсах летась ініцыяваныя даследаванні па распрацоўцы комплексу мерапрыемстваў, накіраваных на падтрыманне ўстойлівага стану папуляцыі еўрапейскага вугра ў Беларусі і на сумежных тэрыторыях. Прааналізаваны дынаміка і эфектыўнасць зарыблення гэтым відам вадаёмаў басейна Нёмана; складзены карты-схемы сучаснага распаўсюджання вугра ў беларускіх вадаёмах, выяўлены перашкоды для яго міграцыі ў межах тэрыторыі нашай краіны ў басейне Нёмана і праведзены шэраг іншых даследаванняў. На гэты год запланавана распрацоўка сумеснага трансгранічнага беларуска-літоўскага плана кіравання рэсурсамі еўрапейскага вугра.

Міністэрства лясной гаспадаркі таксама ўдзельнічае ў рэалізацыі мерапрыемстваў Нацыянальнага плана дзеянняў па захаванні і ўстойлівым выкарыстанні біялагічнай разнастайнасці на 2016—2020 гады. Цяпер у Беларусі ажыццяўляецца адна з найбольш паспяховых праграм па захаванні і павелічэнні колькасці жывёл — рассяленне высакароднага алення. За апошнія чатыры гады ў нашай краіне расселена больш за 3,5 тысячы гэтых жывёл. У параўнанні з 2006 годам колькасць казулі вырасла на 180 %, а высакароднага алення — на 330 %.

Выклікае пэўную заклапочанасць колькасць рысі — па выніках падлікаў у 2020 годзе яна склала ўсяго 1045 асобін. Вядома, што ў некаторых раёнах Беларусі папуляцыя гэтага драпежніка блізкая да аптымальнай, у іншых — значна меншая. Па словах Аляксандра Чайкоўскага, аптымальная колькасць рысі для нашай краіны — больш за 1500 асобін. Цяпер распрацоўваецца план кіравання яе папуляцыяй.

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**

*Дарагія сябры, калегі!*

*Паважаныя суайчыннікі і госці Беларусі!*

*Ад усёй душы віншую вас з Сусветным днём навакольнага асяроддзя, а эколагаў — з прафесійным святам!*

*Хачу падзякаваць прафесіяналам-эколагам і грамадскім дзеячам за ўнёсак у ахову атмасфернага паветра, вады і зямлі, а таксама кіраўнікам прадпрыемстваў, якія зніжаюць негатыўнае ўздзеянне вытворчасці на навакольнае асяроддзе, усім жыхарам нашай краіны, якія разумеюць, што ад паважлівага стаўлення да прыроды залежыць яе чысціня, а значыць, і будучыня нашых дзяцей і ўнукаў.*

*У Зямлі няма іншых рук і сэрцаў, акрамя нашых, і каму, як не нам, несці адказнасць за стварэнне якаснага жыцця для наступных пакаленняў!*

*Сёння праблемы экалогіі стаяць у шэрагу самых важных, вызначаючы ўзровень дабрабыту ўсёй сусветнай цывілізацыі. Захаваць родную прыроду, зберагчы чыстае паветра і карысныя выкапні для наступных пакаленняў — наша агульная задача.*

*Дзякуючы зладжанай рабоце і рашучым дзеянням спецыялістаў-эколагаў і грамадскасці год ад году паляпшаецца наша з вамі асяроддзе пражывання, скарачаюцца выкіды забруджвальных рэчываў у атмасферу і водныя аб'екты, аднаўляюцца дзясяткі гектараў раней парушаных зямель, водна-балотных угоддзяў, лясных масіваў. У наша грамадства ўсё больш інтэнсіўна прыходзяць «зялёныя» тэхналогіі, устойлівыя мадэлі спажывання і вытворчасці, экалагічна дружалюбны лад жыцця.*

*Шчыра жадаю ўсім, хто цяпер працуе ў шэрагах абаронцаў прыроды, поспехаў у рэалізацыі задуманага, новых здзяйсненняў, падтрымкі вашых калег, родных і блізкіх. Шчасця вам, здароўя і дабрабыту!*

*Дарагія сябры, прафесіяналы і ўсе, хто па покліч душы называе сябе эколагам!*

*Упэўнены, што сумеснымі намаганнямі мы зможам зберагчы і прымножыць унікальную прыроду нашай роднай Беларусі.*

**Андрэй ХУДЫК,**
**міністр прыродных рэсурсаў**
**і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.**

Ведай нашых!

# ЛЮБОЎ ДА ЗЯМЛІ

## Як адраджаецца маладзёжны геалагічны рух у Беларусі?

**Геалогія — навука вельмі цікавая і карысная. Нездарма дзіцяча-юнацкі геалагічны рух быў папулярны ў Савецкім Саюзе. У Расіі і некаторых краінах СНД ён развіваецца і цяпер амаль бесперапынна. Там шмат тэматычных школ і клубаў, і дзеці займаюцца з вельмі ранняга ўзросту. У Беларусі ж гэты кірунак пачаў аднаўляцца толькі з 2017 года. Падтрымліваць хлопцаў і дзяўчат, якія робяць першыя крокі ў геалогіі, а таксама моладзь, што вырашыла звязаць сваё жыццё з гэтай навукай, — адна з важных задач Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

### Вярнуць цікавасць

Першая і пакуль адзіная каманда «Юныя геолагі Беларусі» сфарміравалася ў нашай краіне тры гады таму. Тады Мінпрыроды прапанавала навучэнцам Мінскай сярэдняй школы № 53, якія ўжо займаліся геалогіяй пад кіраўніцтвам настаўніцы геаграфіі Жанны Гвозд, прыняць удзел у Міжнароднай палявой алімпіядзе юных геолагаў у рамках XI Усерасійскай адкрытай палявой алімпіяды. Заручыўшыся падтрымкай НВЦ па геалогіі, беларускай кампаніі з прыватным капіталам, геаграфічнага факультэта БДУ і асабіста Дзмітрыя Курловіча, загадчыка кафедры глебазнаўства і зямельных інфармацыйных сістэм геафака БДУ, які таксама выступіў кіраўніком каманды, хлопцы і дзяўчаты змаглі за кароткі тэрмін падцягнуць свае веды. Вынікам такой грунтоўнай падрыхтоўкі стала заваяваная імі на алімпіядзе «бронза», а яшчэ праз два гады (менавіта з такім інтэрвалам праходзіць Міжнародная алімпіяда) — «серабро».



chips-journal.ru

— Нашы юныя геолагі паказваюць вельмі добрыя вынікі. Асабліва ўлічваючы іх невялікі вопыт у палявых алімпіядах у параўнанні з тымі ж расійскімі камандамі. Неадназоча мы атрымлівалі пахвальныя водгукі на адрас нашых хлопцаў і дзяўчат ад калег з Мінпрыроды Расіі, што не можа не выклікаць гонару і жадання расці далей, — адзначае **начальнік галоўнага ўпраўлення прыродных рэсурсаў Мінпрыроды Васіль КОЛБ.** — Неабходна развіваць маладзёжны геалагічны рух, каб у нас былі падобныя каманды па ўсёй краіне. Школьнікі павінны ведаць, што ёсць такая важная прафесія — геолаг, якая ўключае ў сябе мноства напрамкаў. Для гэтага праводзяцца алімпіяды і конкурсы. Спадзяёмся, іх з кожным годам будзе больш.

*(Заканчэнне на 10-й стар.)*

# «Неабходна мабілізацыя ўсіх узроўняў улады, грамадства і бізнесу для сумесных дзеянняў па ахове прыроды»

**Ад таго, наколькі беражліва людзі ставяцца да прыроды, залежыць якасць іх жыцця, здароўе і нават дабрабыт. Невыпадкова ў шэраг складнікаў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь уключана падтрыманне экалагічнай бяспекі — стану абароненасці навакольнага асяроддзя, жыцця і здароўя грамадзян ад розных пагроз, якія ідуць як ад прыроды, так і ад самога чалавека.**

**За апошнія гады ў Беларусі зменшыўся негатыўны ўплыў гаспадарчай дзейнасці на цэласнасць экалагічных сістэм, палепшылася экалагічная сітуацыя ў краіне, эканоміка пачала пераходзіць на «зялёныя» рэйкі. Але па-ранейшаму ў сферы аховы прыроды застаецца шмат пытанняў, вырашыць якія немагчыма без узаемадзеяння органаў улады, інстытутаў грамадзянскай супольнасці, дзелавых колаў.**

## Уласныя рэсурсы — аснова развіцця

***— Андрэй Паўлавіч, на пасяджэнні выніковай калегіі міністэрства вы казалі пра неабходнасць павышэння выкарыстання ўласнай мінеральнай сыравіны. Чаму гэты кірунак важна развіваць?***

— Устойлівае развіццё эканомікі Беларусі немагчыма без збалансаванага выкарыстання і ўзнаўлення мінеральна-сыравінных рэсурсаў. Пры гэтым важна змяншаць залежнасць ад імпарту мінеральнай сыравіны і павышаць экспартны патэнцыял уласных рэсурсаў. Гэта ў тым ліку дапамагае развіваць рэгіёны, павялічваць узровень і якасць жыцця насельніцтва.

На тэрыторыі нашай краіны сканцэнтраваны велізарныя запасы калійных і каменнай солі, даламіту, мелу і мергельна-мелавых парод, сыравіны для вытворчасці будматэрыялаў, торфу, сапрапеляў, прэсных і мінеральных падземных вод і іншых. За апошнія тры гады ў работу перададзена каля ста новых радовішчаў карысных выкапняў: нафты, нафтавага спадарожнага газу, пясчана-жвіровa-валуннага матэрыялу і пяску, торфу, сапрапелю, трэпелу. На базе радовішчаў рэалізуюцца інвестыцыйныя праекты на суму каля 3,5 мільярда долараў ЗША.

Але, нягледзячы на штогадовае забеспячэнне прыросту запасаў карысных выкапняў розных відаў, не ўсе радовішчы сёння запатрабаваны ў некаторых галінах. Не цалкам выкарыстоўваюцца запасы калійных і каменнай солі, даламіту, мелу і мергельна-мелавых парод, шкляных і сілікатных пяскоў, будаўнічага каменю, гліністай сыравіны, торфу, сапрапелю, прэсных і мінеральных падземных вод. Праз гэта краіна недаатрымлівае сродкі: плаціцца менш падатку за здабычу прыродных рэсурсаў; менш вяртаецца бюджэтных сродкаў, укладзеных дзяржавай у разведку гэтых радовішчаў; не скарачаецца імпарт карысных выкапняў, якія разведаны, але пакуль не распрацоўваюцца ў нашай краіне.

Таму розным ведамствам і органам улады важна сумесна працаваць над максімальным уцягваннем у гаспадарчы абарот разведаных карысных выкапняў, у тым ліку прыцягваць інвестараў.

***— На вуліцах Мінска і іншых гарадоў з'явіліся электробусы, развіваецца і пракат веласіпедаў, самакатаў. Выбіраючы такі транспарт, беларусы дапамагаюць скарачаць шкодныя выкіды ў паветра. Якія яшчэ меры павінны прымацца па зніжэнні забруджвання «лёгкіх» нашых населеных пунктаў?***

— Так, сапраўды, стварэнне «зялёных» транспартных сістэм дазваляе змяншаць выкіды забруджвальных рэчываў і парніковых газаў, пашыраць выкарыстанне новых відаў паліва.

Рэалізацыя прынятай у 2013 годзе Стратэгіі па зніжэнні шкоднага ўздзеяння транспарту на атмасфернае паветра Рэспублікі Беларусь да 2020 года дазволіла скарацiць долю выкідаў з 68 % у 2013 годзе да 63 % у 2019-м.

У нашай краіне актыўна развіваецца пасажырскі электратранспарт: электробусы, тралейбусы, трамваі і электрацягнікі. Цяпер у краіне зарэгістравана каля 360 электрамабіляў, больш за 80 электробусаў і звыш 250 зарадных станцый. Развіццё электратранспарту становіцца нацыянальным прыярытэтам.

У 2019 годзе сумарны выкід забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ў параўнанні з 2016 годам зменшыўся на 1,1 %. Пры гэтым асноўнае зніжэнне выкідаў дасягнута за кошт іх скарачэння менавіта ад мабільных крыніц.

Вельмі важна таксама павялічваць патэнцыял выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі (АКЭ), у тым ліку энергіі біягазу, натуральнага руху водных патокаў, біямасы, цяпла зямлі і іншых. У 2019 годзе выдадзены сертыфікаты аб пацвярджэнні паходжання энергіі па 11 зноў створаных устаноўках па выкарыстанні АКЭ агульнай сумарнай магутнасцю 83,101 МВт. Уведзены ў эксплуатацыю тры ветраэнергетычныя ўстаноўкі сумарнай магутнасцю 7,75 МВт.

З ліпеня 2019-га да студзеня 2020 года Мінпрыроды забяспечыла 40 горных адводаў для выкарыстання петрагеатэрмальных рэсурсаў у мэтах цеплазабеспячэння гандлёвых аб'ектаў і АЗС. Такі кірунак неабходна развіваць, бо гэты від энергіі экалагічна чысты і безадходны.

Перспектыўны напрамак таксама — распрацоўка планаў устойлівай гарадской мабільнасці. Гэтыя планы ўключаюць мерапрыемствы па комплексным развіцці грамадскага і веласіпеднага транспарту, стварэнні ў цэнтрах гарадоў тэрыторый і прастораў, дзе перавага руху будзе аддадзена пешаходам, і шмат іншага. Цяпер Мінпрыроды сумесна з Праграмай развіцця ААН рэалізуе праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Беларусь: падтрымка зялёнага горадабудаўніцтва ў малых і сярэдніх гарадах Беларусі», у рамках якога распрацоўваюцца планы ўстойлівай гарадской мабільнасці для 12 гарадоў.

## Парадак пачынаецца з малога

***— З мэтай стымулявання навядзення парадку на месцах вы прапануеце ўкараніць рэйтынг экалагічнага развіцця па рэгіёнах Беларусі. Чаму важна ўключаць экалагічны складнік у ацэнку дзейнасці рэгіёнаў?***


Фота Анатоля ДРЫБАСА.

— Так, гэтая тэма цяпер для нас актуальная. Экалагічны рэйтынг развіцця — не толькі навядзенне парадку на зямлі, а хутчэй комплексны падыход, пры якім будзе праводзіцца параўнальная ацэнка па рэгіёнах, гарадах па трох кірунках:

— стан навакольнага асяроддзя (атмасфернае паветра, водныя рэсурсы, вада, глеба, біяразнастайнасць, ААПТ, доля зялёнай і воднай паверхняў і іншае),

— дзейнасць у рэгіёне па скарачэнні экалагічнай нагрузкі: узровень інвестыцый у ахову навакольнага асяроддзя; гадавое спажыванне энергіі; працэнт энергіі, якая атрымліваецца з аднаўляльных крыніц энергіі, цвёрдых камунальных адходаў; выкарыстанне грамадскага транспарту; колькасць мадэрнізаваных прадпрыемстваў, экалагічных тэхналогій; энергаэфектыўны жыллёвы сектар; колькасць прыродаахоўных бізнес-праектаў і г. д.;

— дзейнасць па павышэнні экалагічнай культуры: экалагічная адукацыя, падтрымка здаровага спосабу жыцця, працягласць веласіпедных маршрутаў, грамадская прастора для адпачынку на адкрытым паветры, зялёныя зоны, працэнт азелянення, даступнасць экалагічнай інфармацыі, якасць паслуг у сферы прыродакарыстання; колькасць праектаў, у якіх грамадзяне бралі грамадскі ўдзел; распрацоўка стратэгій, праграм, планаў павышэння ўстойлівасці да змены клімату.

Адказ на пытанне, чаму важна ўключаць экалагічны складнік у ацэнку дзейнасці рэгіёнаў, дае само вызначэнне ўстойлівага развіцця. Яго базай з'яўляецца гарманічнае спалучэнне прыярытэтаў трыяды: эканоміка, прырода, грамадства.

У 2020 годзе праводзіцца навукова-даследчая работа «Распрацоўка экалагічнага рэйтынга развіцця рэгіёнаў Беларусі і метадалогіі яго фарміравання». Мы плануем узяць найлепшае з міжнароднага досведу і адаптаваць да ўмоў нашай краіны.

***— Хто больш дапускае правапарушэнняў у прыродаахоўнай сферы — грамадзяне ці юрыдычныя асобы? Наколькі ў цэлым эфектыўная кантрольная дзейнасць Мінпрыроды?***

— Кантрольная дзейнасць Мінпрыроды накіравана ў першую чаргу на прадухіленне, а затым ужо выяўленне і стрыманне парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства. Таму інспектары аховы прыроды ў сваёй рабоце робяць акцэнт на меры прафілактычнага і папераджальнага характару (маніторынгі, мерапрыемствы тэхнічнага, тэхналагічнага, праверачнага характару, накіраванне рэкамендацый і патрабаванняў па ліквідацыі і недапушчэнні недахопаў).

У 2019 годзе органы Мінпрыроды правялі больш за 17 тысяч такіх мерапрыемстваў і выявілі каля 38 тысяч парушэнняў і недахопаў прыродаахоўнага заканадаўства. Таксама падчас 335 выбарачных праверак суб'ектаў гаспадарання выяўлена больш за дзве тысячы парушэнняў.

Пра тое, хто больш парушае, сведчыць статыстыка. У 2019 годзе гэта былі 20 850 юрыдычных, 5081 службовая, 1119 фізічных асоб.

Па-ранейшаму найбольшая колькасць правапарушэнняў — у галіне абыходжання з адходамі. Напрыклад, было выяўлена 2,5 тысячы фактаў захавання другасных матэрыяльных рэсурсаў і прыцягнута да адказнасці 959 вінаватых асоб.

Што датычыцца нанясення шкоды навакольнаму асяроддзю, то з больш чым 900 такіх фактаў, выяўленых летась, большая частка зафіксавана ў галіне аховы і выкарыстання аб'ектаў раслiннага свету (незаконнае выдаленне, выключэнне, знішчэнне, пашкоджанне дрэў ці кустоў да ступені спынення росту).

Важна разумець: калі суб'екты гаспадарання будуць выконваць прыродаахоўнае заканадаўства, прадухіляць шкодныя наступствы сваёй дзейнасці на навакольнае асяроддзе і беражліва адносіцца да прыродных багаццяў, то і экалагічнае становішча ў краіне таксама будзе спрыяльнае.

## Змяняецца клімат — час мяняцца самім

***— Тэма Сусветнага дня навакольнага асяроддзя ў 2020 годзе прысвечана захаванню біяразнастайнасці. Вырашэннем якіх праблем у гэтай галіне сёння займаецца Мінпрыроды?***

— Каб эфектыўна ахоўваць біялагічную і ландшафтную разнастайнасць, у нашай краіне створана і дзейнічае сістэма асабліва ахоўных прыродных тэрыторый (ААПТ). У межах ААПТ жыве каля 80 % відаў рэдкіх і тых, што знаходзяцца пад пагрозай знікнення, дзікарослых раслін і каля 90 % відаў дзікіх жывёл.

На 1 студзеня 2020 года ў краіне функцыянуе 1297 ААПТ на пло-

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



шчы 1870,1 тысячы гектараў (адзін запаведнік, чатыры нацыянальныя паркі, 381 заказнік, 911 помнікаў прыроды). З 2016 да 2019 года плошча ААПТ павялічылася на 71,4 тысячы гектараў і дасягнула 9 % ад агульнай плошчы краіны.

Важна разумець, што прыроднае асяроддзе змяняецца — гэта звязана як з інтэнсіфікацыяй гаспадарчай дзейнасці, так і са зменай клімату. Таму і сістэму ААПТ трэба развіваць і ўдасканальваць, зразумела, з улікам захавання экалагічных сістэм і прыродных кампанентаў, важных для падтрымання біялагічнай разнастайнасці і фарміравання нацыянальнай экалагічнай сеткі. Напрыклад, варта прасоўваць экалагічны турызм на ААПТ.

Калі казаць пра рэдкія віды, то мерапрыемствы па ахове, стабілізацыі і павелічэнні колькасці відаў дзікіх жывёл, якія знікаюць на глабальным узроўні, таксама даюць добрыя вынікі.

Напрыклад, колькасць еўрапейскага зубра ў Беларусі ўвесь час расце — за 29 гадоў яна павялічылася больш чым у 6,2 раза і па стане на 1 сакавіка 2020 года складае 2043 асобіны. У нашай краіне створана 10 мікрапапуляцый зубра. У 2018—2019 гадах пачала фарміравацца 11-я Дзятлаўская мікрапапуляцыя, якая ўжо дала першае патомства. Сёння Беларусь займае першае месца ў свеце па колькасці зуброў, што жывуць вольна, пры гэтым доля палагоўя віду складае 35 % ад сусветнай колькасці і гарантуе доўгатэрміновае выжыванне яго беларускай папуляцыі.

Займаецца Мінпрыроды і пытаннямі мінімізацыі негатыўнага ўплыву інвазійных чужародных відаў дзікарослых раслін на экалагічныя сістэмы. Нам неабходна і далей скарачаць плошчы, занятыя пад такія расліны, як баршчэўнік Сасноўскага і сумнік канадскі, — сёлета гэтыя работы будуць праведзены на 4615,7 і 2848,0 гектара адпаведна.

Важна таксама ўцягваць у гаспадарчы абарот біялагічныя рэсурсы. Толькі за мінулы год Беларусь экспартавала больш за 23 тысячы тон прадукцыі раслиннага свету (свежыя плады, ягады і прадукты іх перапрацоўкі) і грыбоў коштам каля 60 мільёнаў долараў ЗША. Расцуць нарыхтоўкі вінаграднага смаўжа, даўгапалага рака, лічынак хіранамід. Паступленні валютных сродкаў ад экспарту вінаграднага смаўжа за апошнія пяць гадоў склалі каля 4 мільёнаў долараў.

***— Як у Беларусі выконваецца План мерапрыемстваў па рэалізацыі палажэнняў Парыжскага пагаднення?***

— Скіраванасць Рэспублікі Беларусь на ўстойлівае развіццё немагчымая без вырашэння праблемы змены клімату. Па Парыжскім пагадненні наша краіна ўзяла на сябе абавязацельствы да 2030 года зменшыць выкіды парніковых газаў на 28 % у параўнанні з 1990-м. Па ацэначных звестках, за 2019 год выкіды скараціліся ўжо не менш чым на 30 %. Таму мы маем намер павялічыць свае нацыянальныя абавязацельствы па скарачэнні выкідаў парніковых газаў да 2030 года не менш чым на 35 % у параўнанні з 1990 годам выключна за кошт уласных рэсурсаў.

**«Каб эфектыўна ахоўваць біялагічную і ландшафтную разнастайнасць, у нашай краіне створана і дзейнічае сістэма асабліва ахоўных прыродных тэрыторый (ААПТ). У межах ААПТ жыве каля 80 % відаў рэдкіх і тых, што знаходзяцца пад пагрозай знікнення, дзікарослых раслін і каля 90 % відаў дзікіх жывёл».**

Беларусь мае адзін з самых высокіх паказчыкаў лясістасці ў Еўропе (39,8 % тэрыторыі) і вялікія плошчы неасушаных балот (каля 7 % тэрыторыі), якія звязваюць і выводзяць з атмасферы вуглякіслы газ.

Паводле ацэнак вучоных, у лясным фондзе краіны назапашана 3,5 мільярда тон вугляроду, з якіх тры чвэрці прадстаўлена арганічным вугляродам глебы, у тым ліку больш за 60 % — вугляродам торфу. У балотах акумуляваны 0,5 мільярда тон вугляроду, а захаваныя ў натуральным стане балоты штогод выводзяць з атмасферы каля 900 тысяч тон дыяксіду вугляроду і вызваляюць у атмасферу 630 тысяч тон кіслароду.

Важным крокам у справе змякчэння наступстваў ад змены клімату стала прыняцце летась Закона «Аб ахове і выкарыстанні тарфянікаў».

Беларусь — адзін з сусветных лідараў па аднаўленні парушаных балотных экасістэм. Такія мерапрыемствы ўжо праведзены на тэрыторыі звыш 60 тысяч гектараў.

У 2020 годзе ў рамках праекта ПРААН/ГЭФ «Ветландс» працягваюцца работы па экалагічнай рэабілітацыі тарфянікаў у Смаргонскім, Вілейскім, Шаркаўшчынскім, Мёрскім, Лідскім раёнах. У другой фазе праекта ўрада Рэспублікі Карэя і Канвенцыі ААН па барацьбе з апустыньваннем «Аднаўленне асушаных тарфянікаў у Беларусі» будуць паўторна забалочаны тарфянікі ў Хойніцкім і Калінкавіцкім раёнах плошчай не менш за дзве тысячы гектараў.

У развіццё нацыянальнага Плана мерапрыемстваў па рэалізацыі Парыжскага пагаднення наша краіна працуе не толькі над зніжэннем выкідаў парніковых газаў, але і над мерамі па адаптацыі і павелічэнні паглынання гэтых газаў.

Напрыклад, Міністэрствам лясной гаспадаркі зацверджаны Нацыянальны план дзеянняў па павелічэнні абсорбцыі паглынальнікамі парніковых газаў на перыяд да 2030 года, Стратэгія адаптацыі лясной гаспадаркі Беларусі да змены клімату да 2050 года і Нацыянальны план дзеянняў па адаптацыі лясной гаспадаркі Беларусі да змены клімату да 2030 года. Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання сумесна з НАН Беларусі распрацавана і зацверджана Стратэгія адаптацыі сельскай гаспадаркі да змены клімату да 2050 года. Шэраг гарадоў і раёнаў прынялі планы па змякчэнні наступстваў змены клімату і адаптацыі да змен клімату на мясцовым узроўні.

Для рэалізацыі палажэнняў Парыжскага пагаднення і Мэт устойлівага развіцця ў краіне распрацоўваецца Стратэгія нізкавугляроднага развіцця на перыяд да 2050 года. Яна будзе прадугледжваць шырэйшае выкарыстанне аднаўляльных крыніц энергіі, будаўніцтва энергаэфектыўнага жылля, развіццё электратранспарту, укараненне ў эканоміку нізкавугляродных і безвугляродных тэхналогій.

Аднак неабходна прымаць да ўвагі, што добрасумленнага выканання Беларуссю павышаных абавязацельстваў, узятых на сябе ў рамках рэалізацыі Парыжскага пагаднення, недастаткова для перааддолення з'яў, выкліканых зменай клімату ў рэгіянальным і глабальным маштабах. Неабходна кансалідацыя намаганняў усіх дзяржаў, а таксама справядлівае размеркаванне тэхнічнай і экспертнай дапамогі краінам, здольным прымаць максімальна эфектыўныя меры ў гэтай сферы.

## Супрацоўніцтва на карысць прыродзе

***— Раскажыце, калі ласка, пра міжнародныя кантакты ведамства.***

— Актыўнае супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя наладжана ў рамках СНД, ЕАЭС, Саюзнай дзяржавы. Адзін з ключавых партнёраў Беларусі ў гэтай сферы — Еўрапейскі саюз.

Вучоныя і спецыялісты Беларусі і краін-суседак праводзяць сумесныя даследаванні ў галіне трансгранічнага забруджвання паветра, аховы водна-балотных угоддзяў, барацьбы з апустыньваннем і дэградацыяй зямель, міграцыі дзікіх жывёл, рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў трансгранічных рэк, развіцця экатурызму і ў іншых важных кірунках прыродаахоўнай дзейнасці.

Штогод рэалізуецца шэраг праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі ў галіне захавання біяразнастайнасці, аднаўлення воднабалотных экасістэм і ўстойлівага кіравання прэснаводнымі экасістэмамі, развіцця электрамабільнага транспарту і нацыянальнай сеткі зарадных станцый, а таксама ветраэнергетыкі, экалагічнага турызму і іншага. Толькі ў 2019 годзе ў рамках рэалізацыі дзевяці праектаў было прыцягнута 28,8 мільёна долараў ЗША і 5,4 мільёна еўра сродкаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі.

Нам цікавы сучасны досвед і найлепшыя практыкі па шэрагу кірункаў палітыкі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, а таксама абыходжання з прамысловымі і бытавымі адходамі, павышэння энергаэфектыўнасці. Гэта дае магчымасць выбіраць найбольш эфектыўныя інструменты рэалізацыі нацыянальнай палітыкі. У сваю чаргу, мы таксама прадставілі партнёрам нашы напрацоўкі па рэалізацыі палітыкі ў галіне захавання біяразнастайнасці, аховы трансгранічных водных рэсурсаў, развіцця асабліва ахоўных прыродных тэрыторый.

Развіваючыся, прамысловасць часта негатыўна ўплывае на навакольнае асяроддзе. Але адначасова з гэтым ва ўсім свеце імкнуцца пераходзіць на «зялёныя» тэхналогіі. Я думаю, што сітуацыя стабілізуецца праз некалькі гадоў і мы прыйдзем да таго, што чалавецтва будзе наносіць меншую шкоду прыродзе.

Цяпер краіны рэалізуюць меры па паляпшэнні стану навакольнага асяроддзя пры распрацоўцы планаў выхаду з крызісу, выкліканага COVID-19. У гэтай сувязі неабходна ўзмацніць міжнароднае супрацоўніцтва, у тым ліку ў галіне абмену вопытам пераадолення наступстваў крызісу і яго ўплыву на экалагічную палітыку дзяржаў. Меры па выхаду з крызісу павінны стаць асновай для структурнай экалагізацыі і пераходу да «зялёнага» развіцця. Бо навакольнае асяроддзе — адзін з індыкатараў здароўя і дабрабыту насельніцтва.

Наша планета занадта малая, каб захаваць дабрабыт адных дзяржаў, ігнаруючы праблемы іншых. І калі кожны з нас будзе лічыць сваім абавязкам зберагчы тое, што дадзена нам прыродай, а таксама прызнае сябе адказным за будучыню планеты Зямля, мы даб'ёмся поспеху ў захаванні нашага агульнага дома для наступных пакаленняў.

***— Як вы ацэньваеце супрацоўніцтва Мінпрыроды з грамадскімі арганізацыямі экалагічнага профілю?***

— Грамадскія аб'яднанні — асноўныя партнёры Мінпрыроды нароўні са сродкамі масавай інфармацыі, органамі дзяржаўнага кіравання, рэлігійнымі арганізацыямі, маладзёжнымі валанцёрскімі экалагічнымі атрадамі, грамадскімі экалагамі. 27 грамадскіх экалагаў уваходзяць у склад Грамадскага каардынацыйнага экалагічнага савета міністэрства.

Хачу падкрэсліць важнасць сумеснай дзейнасці ва ўсіх кірунках — па ўдасканаленні прыродаахоўнага заканадаўства, рэалізацыі экалагічных праектаў, удзеле ў асветніцкай рабоце. Асабліва ўдзячны прадстаўнікам грамадскасці за ўдзел у кампаніі «Добраўпарадкуем малую радзіму».

Грамадскія экалагі — а гэта 415 неабыякавых, адказных людзей — аказваюць істотную дапамогу на месцах у справе наведвання парадку на зямлі. Вынік нашай сумеснай працы павінен быць адчувальным, ён павінен стымуляваць шырокае выкарыстанне «зялёных» тэхналогій, павысіць экалагічную культуру насельніцтва.

Неабходна мабілізацыя ўсіх узроўняў улады, а таксама грамадства і бізнесу на сумесныя дзеянні, накіраваныя на тое, каб паветра і вада былі чыстыя, каб захаваліся лясы, расліны і жывёлы, каб пейзажаў, якія нас акружаюць, не псавалі звалкі бытавых і прамысловых адходаў.

Спадзяёмся на плённае супрацоўніцтва з усімі зацікаўленымі дзяржорганамі і арганізацыямі.

**Вераніка КОЛАСАВА, Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

Грамадская ініцыятыва

# ЗАХАВАЛЬНІКІ ПРЫРОДЫ

## Як стаць грамадскім эколагам?

**Што рабіць, калі побач з вашым домам стварылі несанкцыянаваную звалку, ссеклі любімае дрэва ці спалілі ўсю траву? Вырашыць гэтыя праблемы можна рознымі шляхамі. Адным з найважнейшых кірункаў, звязаных з паляпшэннем стану навакольнага асяроддзя, з'яўляецца кантроль за выкананнем прыродаахоўнага заканадаўства. Гэту сур'ёзную работу выконваюць супрацоўнікі Мінпрыроды. Аднак не апошняе месца займае і дзейнасць грамадскіх эколагаў, шэрагі якіх можа папоўніць кожны ахвотны.**

### Хачу быць эколагам!

Стаць грамадскім эколагам вельмі проста. Для гэтага неабходна звярнуцца ў камітэт або ў раённую (па месцы жыхарства) інспекцыю прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і падаць наступныя дакументы:

• заяву кандыдата ў грамадскія эколагі на імя старшыні камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя;

• характарыстыку з месца работы (навучання) або месца жыхарства, дзе ўказваецца, якімі ведамі і вопытам у галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў валодае кандыдат у грамадскія эколагі;

• дзве каляровыя фатаграфіі 3х4.

Ніякіх абмежаванняў па ўзросце, адукацыі або родзе дзейнасці няма, аднак кандыдат павінен ведаць заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў і, вядома, выконваць яго патрабаванні.

Парадак дзейнасці грамадскіх эколагаў замацаваны ў адпаведнай пастанове Саўміна ад 20.06.2013 г. № 504. У ёй прыведзены асноўныя кірункі супрацоўніцтва з тэрытарыяльным органам Мінпрыроды, які і выдае будучаму эколагу пасведчанне. Гэта могуць быць сумесныя каардынацыйныя саветы з грамадскімі экалагічнымі аб'яднаннямі, а таксама адукацыйная работа ў выглядзе гутарак на экалагічную тэматыку.

### Добрыя прыклады



**Ірына БІРЫНА-ПАЎЛАВА** працуе ў сярэдняй школе № 137 Мінска педагогам дадатковай адукацыі і з 2014 года з'яўляецца грамадскім эколагам. Тры гады таму яна прыйшла да свайго кіраўніцтва і прапанавала арганізаваць аб'яднанне па інтарэсах «Азбука арніталогіі», каб вывучаць птушак Беларусі. Сёння яно ўключае 6 груп, у якіх займаецца больш за 80 чалавек. Гэта, вядома, не адзінае дасягненне педагога. Ірына Веніямінаўна — аўтар мноства адукацыйных праграм і заняткаў у галіне арніталогіі, а таксама розных метадычных рэкамендацый, якія ўжываюцца ў экапедагогіцы. Напрыклад, нядаўна разам з навучэнцамі яна стварыла свой асветніцкі майстар-клас «Качак хлебам не кармі!». Як грамадскі эколаг выйшла з ініцыятывай у Мінскі гарадскі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, дзе прапанавала праводзіць такі майстар-клас на розных экалагічных мерапрыемствах, што арганізуюцца ў сталіцы. Камітэт падтрымаў ініцыятыву і заўсёды запрашае школьнікаў на гэтыя пляцоўкі. Выхаванцы Ірыны Бірынай-Паўлавай



паспяхова абараняюць экалагічныя даследчыя работы на навуковых канферэнцыях не толькі ў Беларусі, але і за мяжой.

— За апошнія гады прыроднае асяроддзе вакол нас пачало катастрафічна змяняцца ў горшы бок: шмат смецця, звалак. Я зразумела, што так абыходзіцца з прыродай нельга. Гэта і паслужыла штуршком для таго, каб заняцца педагагічнай дзейнасцю, сабраць вакол сябе неабыякавых хлопчыкаў і дзяўчынак. Каб разам вучыцца спазнаваць і разумець свет прыроды, любіць і берагчы яго, — так растлумачыла Ірына Веніямінаўна рашэнне не толькі стаць грамадскім эколагам, але і ў цэлым прысвяціць сваё жыццё ахове прыроды і экапедагогіцы.



**Алег СОЗІНАЎ**, загадчык кафедры батанікі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы, кандыдат біялагічных навук, аргументуе свой выбар стаць грамадскім эколагам тым, што вучоныя як ніхто іншы могуць паспрыяць вырашэнню многіх экалагічных праблем.

— Адзін з яркіх прыкладаў, калі навукоўцы і грамадскасць збіраюцца разам для вырашэння праблемных пытанняў аховы прыроды, — грамадскія слуханні. Яны праводзіліся, напрыклад, па праблеме лёсу балота Святога, якое знаходзіцца на мяжы Гродзенскага і Шчучынскага раёнаў. Вырашалася пытанне: адрэзаць ад рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Азёры» частку балота для торфаздабычы ці не? Навукоўцы, грамадскасць, народныя дэпутаты, выканаўчая ўлада, Мінпрыроды публічна абаранілі правa балота на жыццё. Я лічу, гэта перамога — найбольш яркая праява кансалідацыі грамадства ў захаванні натуральнага навакольнага асяроддзя для сябе і будучых пакаленняў, — адзначыў спецыяліст.

Не варта забываць, што галоўная роля грамадскага эколага — гэта не толькі выяўленне парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства, а ў першую чаргу фарміраванне на ўласным прыкладзе беражлівага і паважлівага стаўлення да прыроды, стварэнне ў соцыуме культуры гарманічнага суіснавання чалавека і дзікай прыроды.

**Кацярына ЦІТОВА. Фота з архіва герояў.**

Далучайцеся!

# Экалагічныя конкурсы чакаюць сваіх удзельнікаў

**Штогод Мінпрыроды і яго тэрытарыяльныя органы, а таксама часопіс «Родная прырода» праводзяць шэраг конкурсаў экалагічнай скіраванасці. Узяць удзел у некаторых з іх можна ўжо зараз.**

**Рэспубліканскі конкурс на найлепшую публікацыю экалагічнай тэматыкі (з 15 мая да 15 жніўня ў два этапы)**

Гэты конкурс — для творчых асоб рознага ўзросту (школьнікаў, аматараў і прафесіяналаў), аб'яднаных любоўю да роднай зямлі.

Каб стаць яго ўдзельнікам, трэба да 6 ліпеня 2020 года накіраваць у абласныя і Мінскі гарадскі камітэты прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя свае работы з пазнакай «На рэспубліканскі конкурс на найлепшую публікацыю экалагічнай тэматыкі». Гэта могуць быць нарысы, артыкулы, рэпартажы, агляды, замалёўкі, нататкі і каментары аб беражлівым стаўленні да прыроды, навядзенні парадку на зямлі, добраўпарадкаванні тэрыторыі населеных пунктаў, абыходжанні з адходамі, ахове водных рэсурсаў, атмасфернага паветра, жывёльнага і расліннага свету, укараненні новых тэхналогій у галіне аховы навакольнага асяроддзя, захаванні помнікаў прыроды і іншыя матэрыялы па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў.

Матэрыялы павінны быць апублікаваны ў перыядычных выданнях у перыяд з 15 мая 2019 года да 15 мая 2020 года. Пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі і грашовымі прэміямі.

Дадатковую інфармацыю пра ўдзел у конкурсе можна знайсці на сайтах тэрытарыяльных органаў Мінпрыроды.

**Гарадскі конкурс фотаздымкаў на экалагічную тэматыку «Зялёны Мінск — 2020»**

Конкурс праводзіцца з 30 сакавіка да 16 лістапада 2020 года на тэрыторыі Мінска.

Узяць удзел у ім могуць усе ахвотныя — як прафесійныя фатографы, дызайнеры, так і аматары.

Для ўдзелу ў адборы аўтарам трэба даслаць прэв'ю сваіх фота ў электронным выглядзе на адрас Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя minskpriroda@gmail.com да 1 кастрычніка 2020 года.

Работы ў цэлым павінны адпавядаць тэматыцы конкурсу «Зялёны Мінск». Яны прымаюцца ў намінацыях «Прыродныя фантазіі», «Мой зялёны горад», «Чалавек у згодзе з прыродай», «Пад незвычайным вуглом», «Экалогія Мінска вачыма жыхароў», «Экапрыколы», «Экалогія горада і царква», «Вадаёмы Мінска», «Альтэрнатыўныя віды транспарту», «Найлепшая макрафатаграфія».

Работы пераможцаў будуць размешчаны ў эколага-інфармацыйным календары камітэта на 2021 год, а таксама стануць экспанатамі выставак у 2020-2021 гадах.

Падрабязная інфармацыя пра ўдзел у конкурсе — на сайце Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

**Конкурс «Краявіды малой радзімы» ад часопіса «Родная прырода»**

Запрашаем чытачоў «Роднай прыроды» да ўдзелу ў конкурсе, прысвечаным прыродзе роднага краю. Мы чакаем ад вас фотаздымкаў, а таксама вершаў і замалёвак, у якіх вы расказваеце пра сваю малую радзіму. Вынікі конкурсу падвядзём у канцы года. Пераможцы атрымаюць прызы і падарункі.

**Дасылайце свае работы на адрас: вул. Захарава, 19, Мінск, 220034 ці на e-mail: pryroda@zviazda.by.**

# ЛЮБОЎ ДА ЗЯМЛІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

На жаль, сёння геалогія як універсітэцкая спецыяльнасць не карыстаецца сярод абітурыентаў той папулярнасцю, што ў былыя гады. Штогод у краіне выпускаецца ўсяго каля 40 маладых спецыялістаў, з якіх менш за палову застаецца ў прафесіі.

— Падчас наведвання нашых вытворчых аб'ектаў мы заўсёды размаўляем з маладымі геолагамі, якія працуюць у палявых умовах, высвятляем, якія ў іх ёсць праблемы і прапановы, і сумесна з НВЦ па геалогіі абмяркоўваем усе гэтыя моманты. Маладых спецыялістаў абавязкова трэба стымуляваць. Так, дзевяцярым актыўным супрацоўнікам была павышана катэгорыя і, адпаведна, павялічана зарплата. Работа ў гэтым кірунку намі будзе працягнута. Было б жаданне працаваць! — падкрэслівае Васіль Юр'евіч.

### Геалогія вачыма дзяцей

Мы спыталіся ў пераможцаў II Рэспубліканскага геалагічнага конкурсу, вынікі якога былі падведзены днямі ў Рэспубліканскім цэнтры экалогіі і краязнаўства, чаму яны займаюцца геалогіяй і ці хочуць звязаць сваё жыццё з гэтай навукай.

**Ірына КРЫВЁНАК, навучэнка Магілёўскага дзяржаўнага абласнога ліцэя № 1, узнагароджана дыпломам I ступені:**

— З самага дзяцінства я захаплялася гісторыямі пра дыназаўраў, любіла глядзець пра іх фільмы, чытаць кнігі. Мне заўсёды было цікава разглядаць камяні, хацелася даведацца, чаму яны ўсе розныя. З восьмага класа пачала старанна рыхтавацца да алімпіяд па геаграфіі, дзе геалогія была маім любімым раздзелам. А з мінулага года я наведваю заняткі па інтарэсах, якія праводзіць Дзмітрый Уладзіміравіч Поджыгераў. Мы можам не па карцінках вывучаць мінералы і горныя пароды, а ўбачыць іх наяве, патрымаць у руках, панюхаць ці нават пакаштаваць на смак, калі гэта, напрыклад, калійная соль. Геалогія — гэта тая ж гісторыя, але без людзей. Спадзяюся, што буду працаваць калі не ў гэтай прафесіі, то ў сумежнай.

**Ванда ВУЛЬВАЧ, вучаніца сярэдняй школы № 8 Магілёва, узнагароджана дыпломам II ступені:**

— Мяне заўсёды цікавілі ўнутраныя працэсы нашай планеты, яе «ўпарадкаванне» і гісторыя. Можна сказаць, што цікавасць да геалогіі зарадзілася дзякуючы дзіцячай дапытлівасці. Цяпер больш за ўсё мяне прыцягвае мінералогія. Здаецца, што незвычайнага можа быць у камянях? Але насамрэч пры дапамозе мінералаў і горных парод можна даведацца шмат новага пра свет. Да таго ж на аснове мінералогіі і яе даных будуецца ўся наша гаспадарка і прамысловасць. Я магу гадзінамі вывучаць гісторыю і ўласцівасці розных мінералаў — мне гэта сапраўды падабаецца! Нядаўна, напрыклад, здзівіла сваіх аднакласнікаў на занятках па інтарэсах «Юныя геолагі», куды хаджу ўжо год, ведамі пра мінерал ісландскі шпат. Я лічу, што работа павінна прыносіць радасць і карысць, таму цалкам магчыма, што сваю будучыню звяжу менавіта з геалогіяй.



**Кацярына ЦІТОВА.**

Прапанова з канверта

# ПЛАЦІЦЬ БЫ РАДЫ...

## Але як?

**Пра неабходнасць трымаць бяспечную дыстанцыю, пазбягаць залішніх кантактаў цяпер гаворыцца шмат. Ды і робіцца многае.**

У асаблівай сацыяльнай абароне маюць патрэбу людзі, абцяжараныя хранічнымі захворваннямі, адзінокія, састарэлыя пенсіянеры. Ім усім, прычым досыць настойліва, раяць абмяжоўвацца прасторай сваёй кватэры ці хаты. Яны, можа, і рады б, але ж нідзе не дзенешся — трэба хадзіць у крамы, купляць лекі, плаціць за камунальныя паслугі, тэлефон, інтэрнэт...

Мясцовыя ўлады, аддзелы сацыяльнага забеспячэння, валанцёры, сваякі і проста людзі нераўнадушныя адгукаюцца на просьбы аб дапамозе, праяўляюць клопат... Аднак, на мой погляд, яго можна зрабіць больш дзейсным і пры гэтым — значна спрасціць.

Што я маю на ўвазе?

Тыя, хто атрымлівае пенсіі не на банкаўскія карткі, а ў паштовых аддзяленнях, маюць багаты досвед шматлюднага чакання. Без яго, як правіла, не абыходзіцца і аплата ўжо згаданых камунальных паслуг, тэлефонаў, інтэрнэту...

А між тым службы ЖКГ маглі б вызначыць сярэднія штомесячныя плацяжы па асобных кватэрах (расход цяпла, вады і электрычнасці можна ўдакладніць тэлефоннымі званкамі) і з пісьмовага дазволу кватэраздымшчыкаў — уладальнікаў жылля прадставіць гэтыя звесткі службам, якія налічваюць пенсіі.

Такім чынам грошы маглі б аўтаматычна пералічвацца адрасатам, а людзям у выніку не трэба было б нервавацца ў шматлюдных чэргах ці абцяжарваць сваімі просьбамі іншых (добра, калі ёсць каго).

Думаю, што гэткі ж спосаб аплаты камунальных паслуг можна распаўсюдзіць і на тых, хто атрымлівае зарплату, нават на тых, хто мае так званыя вольныя ці лішнія грошы. А што — пералічыў суму на тры-пяць месяцаў наперад, і ніякіх табе турбот. У паштовую скрынку разам са звычайнай «жыроўкай» прыйдзе справаздача пра твой асабісты баланс.

...Людзі маладзейшыя могуць мне запярэчыць: маўляў, навошта агарод гарадзіць, калі за камунальныя паслугі так проста разлічыцца са свайго хатняга камп'ютара? На што старэйшыя ім адкажуць, што сёння далёка не ў кожнага пенсіянера ёсць той камп'ютар і далёка не кожны ўмее ім карыстацца.

Разумею: рэалізацыя маёй прапановы запатрабуе пэўнай перабудовы, у некага з работнікаў з'явяцца новыя абавязкі, за іх, відавочна, давядзецца даплачваць... Але гульня будзе вартая свечак, бо мы зможам пазбегнуць шматлюдных зносін.

...Значна складаней — зноў жа на мой погляд — пералічваць нейкую авансавую суму, заводзіць асабістыя рахункі ў крамах, паслугамі якіх увесь час карыстаюцца тыя ж пенсіянеры. Але згадзіцеся, што пры жаданні нават гэта магчыма! Тады і гандлю стане значна прасцей асвойваць метад дастаўкі тавараў непасрэдна пакупніку, і валанцёрам (ці тым, хто іх замяшчае)...

Такую ж сістэму аплаты можна прадумаць і ў аптэках.

Згодзен: гэта нязвыкла і камусьці больш клапотна, але ж галоўная мэта будзе дасягнута. Мы ўвядзём у дзеянне калектыўную антывірусную абарону, дзейсны дзяржаўны клопат пра тых, хто чакае штодзённай дапамогі.

Дэталізаваць, ці «аблічбаваць», сутнасць маёй прапановы лёгка могуць праграмісты. Усё будзе кантралявацца і вырашацца аператыўна. Выгада — усеагульная. Дык чаму б нам не стаць ініцыятарамі, першапраходцамі? А паслядоўнікі, думаю, абавязкова будуць.

**Ізяслаў Катляроў,**
*г. Светлагорск.*

Была вайна

# Яны дайшлі да Берліна

**Мой бацька Юрый Філарэтавіч Кірэеў нарадзіўся ў пачатку мінулага стагоддзя — у лютым 1908-га, паспяхова скончыў школу. У інстытут, праўда, паступіць не змог, бо ў той перыяд (аб ім згадвае А. Салжаніцын у даследаванні «Дзвесце гадоў разам») на вучобу прымалі дзяцей рабочых і сялян, а тата быў сынам бухгалтара і хатняй гаспадыні. Да таго ж з яўрэяў...**



**5 мая 1945 года. Бацька ў другім радзе знізу, крайні злева, з фотаапаратам на грудзях.**

Зрэшты, відаць, праўду кажуць, што часам не было б і шчасця, ды няшчасце падмагло: у час вучобы на аграмеліярацыйных курсах тата пазнаёміўся з мамай, ажаніўся... Падчас службы ў войску скончыў так званы ШМАС (школу малодшых авіяцыйных спецыялістаў), дэмабілізаваўся ў званні старшыны. Да вайны працаваў па спецыяльнасці, гадаваў дзяцей — мяне і сястру...

Летам 1941-га тату прызвалі ў дзеючую армію. Служыць яму давялося ў авіяцыі — весці ў тым ліку паветраную разведку за лініяй фронту, а гэта значыць, фатаграфаваць найбольш важныя ваенныя аб'екты, размяшчэнні тэхнікі і нямецкіх сіл. Падчас гэтых здымкаў наш самалёт-разведчык амаль заўсёды трапляў пад шквальны варожы абстрэл, але выконваў пастаўленыя баявыя задачы...

Мой тата меў узнагароды, дайшоў да Берліна. І ўжо там здымаў сяброў-таварышаў — пераможцаў.

...Дасылаю некалькі здымкаў з тых, што захаваліся ў нашым сямейным архіве. Магчыма, нехта з жыхароў Беларусі пазнае на іх сябе альбо сваіх родных і ўспомніць шчаслівы май 1945-га.

**Валерый Юр'евіч Кірэеў,**
**сын салдата.**
*г. Масква.*

# Калі вада — бяда

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Таварыства ратавання на вадзе разгарнула ў цэнтральным рэгіёне дзейнасць 7 станцый і 28 пастоў. Мінімум адзін пост існуе ў кожным раёне. А вось станцыі сканцэнтраваны ў найбольш папулярных сярод адпачывальнікаў месцах. Гэта возеры Мястра і Нарач, што на Мядзельшчыне, гарадскі пляж на рацэ Беразіна ў Барысаве, на Вілейскім і Смалявіцкім вадасховішчах.

— Сітуацыя з летнім адпачынкам складваецца так, што пераважная большасць людзей застанецца гэтым летам у Беларусі, будзе бавіць час на нашых рэках і азёрах, — прагназуе Сяргей Патрыкееў. — Таму мы просім выбіраць для гэтага месцы, якія адмыслова падрыхтаваны і дзе дзяжураць нашы ратавальнікі. За апошнія восем гадоў не было ніводнага выпадку ўтаплення ў такіх зонах адпачынку.

Летась за ўвесь год у Мінскай вобласці патанула 65 чалавек, прычым 40 % з іх — падчас купання. Сёлета вада забрала дзесяць жыццяў, хоць купальны сезон пакуль не стартаваў.

— Шэсць чалавек былі знойдзены ў вадзе без прыкмет гвалтоўнай смерці, пяць з іх незадоўга да гібелі ўжывалі спіртное. Паказальна, што год ад году прыкладна 70 % патанулых знаходзіцца перад смерцю ў нецвярозым стане, — заўважае Сяргей Патрыкееў.


kurjer.info

А вось па краіне з пачатку года ўтапленне стала прычынай смерці 87 чалавек. Дзяцей у гэтым мартыралогу няма. Летась жа лічбы былі іншыя — 90 загінулых, сярод якіх 10 дзяцей. Вадалазы за пяць месяцаў выратавалі 35 чалавек, у тым ліку 7 непаўналетніх.

— Сёлета зарэгістраваны пакуль толькі адзін няшчасны выпадак, звязаны з купаннем, — адзначыў **выканаўца абавязкаў начальніка аддзела рэспубліканскай вадалазна-выратавальнай службы Таварыства ратавання на вадзе Алег БАРАЗНА**. — Адбыўся ён 26 красавіка, яшчэ да афіцыйнага адкрыцця купальнага сезона, у Гродзенскай вобласці. Сталы нецвярозы чалавек вырашыў пакупацца і патануў.

Калі ж прааналізаваць абставіны гібелі людзей, то сумнае лідарства тут маюць падзенні ў ваду (загінулі 49 чалавек), сёлета пачасціліся выпадкі гібелі ў дамашніх ваннах — патанула ўжо васьмёра. Таму калі вы адчуваеце сябе блага — не лезьце ў ваду, няхай сабе і дома.

У Беларусі налічваецца каля 20 тысяч азёр і рэк. «Прыкрыць» іх усе вадалазамі фізічна немагчыма. Тым больш што ў арсенале Таварыства ратавання на вадзе па ўсёй краіне — 66 станцый і 147 выратавальных пастоў, у тым ліку сезонных.

— Яны размешчаны на тых пляжах, дзе збіраецца найбольшая колькасць людзей. Але трэба разумець, што менавіта ад вашых паводзін залежыць ваша жыццё. Падчас адпачынку пільна сачыце за малымі. Дзеці часта не разумеюць ступень пагрозы, якую можа несці вада, для іх гэта як гульня. Для бацькоў пасля — найвялікшая гора.

Адпачынак на вадзе — гэта не толькі купанні, але і падарожжы па акваторыі на лодках, катамаранах. Як адзначае **начальнік Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі Міхаіл ЧАШУН**, з цягам часу колькасць няшчасных выпадкаў, звязаных з «малым флотам», скарачаецца.

— У 2000 годзе ў нас было зарэгістравана каля пяці тысяч суднаў, пры іх выкарыстанні загінула 126 чалавек. За дваццаць гадоў парк разросся шматкроць — зараз у нас на ўліку 330 тысяч суднаў. А вось колькасць няшчасных выпадкаў скарацілася значна. Летась іх было толькі шэсць. На жаль, гэты год будзе стаяць асабняком — сёлета так і не сфарміравалася ледзяное пакрыва, ад чаго лік загінулых быў адкрыты яшчэ ў сярэдзіне студзеня, калі трое жыхароў Верхнядзвінска адправіліся парыбачыць з невялікай «казанкі» на Асвейскім возеры. Выратавальныя камізэлькі апранаць не сталі, проста паклалі іх на дно. Пасля таго як лодка адышла ад берага, усчаўся вецер. Ён справакаваў вялікую хвалю, якая і перакуліла судна. Усе трое апынуліся ў ледзяной вадзе. Адзін з іх пайшоў на дно адразу, другі крыху часу трымаўся за пластыкавую каністру... Выратаваць удалося толькі аднаго рыбака.

20 студзеня, калі пошукі на Асвейскім возеры яшчэ працягваліся, прыйшло паведамленне, што на яго акваторыі перакулілася яшчэ адна лодка. У ёй былі два чалавекі — 28-гадовы міліцыянер і 33-гадовы хірург. На жаль, у ветранае надвор'е ў невялікай лодкі проста не было шанцаў устаяць, а адлегласць больш чым у кіламетр ад берага не пакідала шанцаў выбрацца. Супрацоўнікі Таварыства ратавання на вадзе падаспелі адразу ж, аднак да таго часу адзін з рыбакоў ужо схаваўся пад вадой... Другі дзякуючы камізэльцы трымаўся на плаве, аднак што такое студзеньская тэмпература вады? Літаральна 15—20 хвілін — і проста несумяшчальнае з жыццём пераахаладжанне.

— Мы сутыкаліся з тым, што часам людзі набываюць не камізэлькі, а муляжы-накідкі, каб паказацца перад інспектарам. Але ў вадзе такая накідка не дапаможа, — кажа Міхаіл Чашун.

У мінулыя выхадныя адкрыўся навігацыйны сезон. Праз гэта на тэрытарыяльных участках Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах нярэдка ўзнікаюць вялікія чэргі — людзі спяшаюцца выканаць патрэбныя адміністрацыйныя працэдуры і прайсці тэхнічнае агледжанне.

— Тэрміны яго, а таксама выдача пасведчанняў сёлета падоўжана да 31 ліпеня. Адпаведную пастанову 20 мая прыняў Савет Міністраў. Таму просім усіх не ствараць залішняга ажыятажу, — параіў Міхаіл Чашун.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 88»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-85066, 1974 г. п., площадь – 8,40 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – проходная.<br>Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-95958, 1974 г. п., площадь – 1436,6 кв. м, назначение – здание многофункциональное, наименование – здание многофункциональное, включающее в себя теплопункт (инв. № 22) | Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 232 | 155025,00 | 15502,50 | 7751,25 |
| 2 | 1. Капитальное строение с инвентарным номером 201/С-13971, 1991 г. п., площадью 26,6 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – одинарный блок-контейнер. 2. Капитальное строение с инвентарным номером 201/С-13969, 1991 г. п., площадью 581,0 кв. м, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – здание пилорамы. 3. Капитальное строение с инвентарным номером 201/С-13970, 1991 г. п., площадью 393,2 кв. м, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание мастерских. 4. Кран гаражный (инв. № 745). 5. Рама лесопильная специальная РК-1А б/н (инв. № 11702). 6. Резервуар емк. 25 м³ (инв. № 13275). 7. Станок токарный. 8. Пневмомолот. 9. Печь типа «Горн». 10. Станок заточной. 11. Емкость под опилки «Циклон» | Витебская обл., Городокский р-н, Езерищенский с/с, ул. Ленинская, д. 2 | 20365,00 | 2036,50 | 1018,25 |
| 3 | Капитальное строение с инвентарным номером 250/С-35864, наименование – здание общежития, площадь – 412,7 кв. м | Витебская обл., г. Полоцк, ул. Вологина, д. 4А | 77850,00 | 7785,00 | 3892,50 |
| 4 | Капитальное строение с инв. № 500/С-24034, наименование – административное здание, площадью 332,4 кв. м | г. Минск, ул. Промышленная, 14 | 86450,00 | 8645,00 | 4322,50 |
| 5 | 1. Капитальное строение, здание административно-бытового корпуса, инв. № 500/С-29089, 1867,00 кв. м. 2. Капитальное строение, здание производственно-складского корпуса, инв. № 500/С-29088, 1449,50 кв. м. 3. Капитальное строение, здание производственного корпуса, инв. № 500/С-27590, 2303,40 кв. м. 4. Капитальное строение, здание материального склада, инв. № 500/С-29087, 640,90 кв. м. 5. Капитальное строение, здание проходной, инв. № 500/С-29085, 17,90 кв. м. 6. Капитальное строение, гаражи, инв. № 500/С-29086, 669,80 кв. м. 7. Капитальное строение, здание мойки, инв. № 500/С-66605, 8,90 кв. м. 8. Капитальное строение, склад (в том числе составные элементы – проезд, площадка под стоянку, дорожка, проезд, площадка, эстакада с очистным сооружением мойки, площадка, бордюр 0,16, ворота, калитка, ограждение и др. согласно тех. паспорту), инв. № 500/С-66604, 131,70 кв. м. 9. Сооружение, хозяйственно-питьевая водопроводная сеть, инв. № 500/С-1028261, 530,90 м. 10. Сооружение, ливневая канализационная сеть, инв. № 500/С-1028258, 471,50 м. 11. Сооружение, тепловая сеть, инв. № 500/С-1028260, 23,80 м. 12. Сооружение, хозяйственно-бытовая канализационная сеть, инв. № 500/С-1028259, 125,20 м. 13. Кран-балка электрическая с подкрановыми путями, инв. № 1; 14. Кран-балка электрическая с подкрановыми путями, инв. № 2. 15. Кран-балка электрическая с подкрановыми путями, инв. № 3. 16. Кран-балка электрическая, инв. № 5. 17. Кран-балка электрическая с подкрановыми путями, инв. № 6 | г. Минск, ул. Промышленная, 23 | 3954968,00 | 395496,80 | 197748,40 |

<u>В отношении Лотов 1–2 проводятся седьмые повторные торги. В отношении Лота 3 проводятся пятые повторные торги.</u>
<u>В отношении Лота 4 проводятся третьи повторные торги. В отношении Лота 5 проводятся вторые повторные торги.</u>

Публикация сведений о торгах по Лотам 1–2 размещена на сайте ЕГРСБ объявления № 00041022 от 11.07.2019 г., № 00043426 от 18.09.2019 г., № 00044832 от 22.10.2019 г., № 00044057 от 08.10.2019 г., № 00046594 от 09.12.2019 г., № 00048791 от 10.02.2020 г., № 00050331 от 20.03.2020 г., № 00051870 от 05.05.2020 г. По Лоту 3 – размещена на сайте ЕГРСБ, объявления: № 00044057 от 08.11.2019 г.; № 00046594 от 09.12.2019 г., № 00048791 от 10.02.2020 г., № 00050331 от 20.03.2020 г., № 00051870 от 05.05.2020 г.

По Лоту 4 – размещена на сайте ЕГРСБ, объявления: № 00047174 от 24.12.2019 г., № 00050331 от 20.03.2020 г., № 00051870 от 05.05.2020 г.

По Лоту 5 – размещена на сайте ЕГРСБ, объявления № 00049563 от 02.03.2020 г., № 00051870 от 05.05.2020 г., а также в газете «Звязда», № 43 от 04.03.2020 г. – С. 15.

Также иную информацию касательно торгов можно узнать на сайте организатора торгов: www.orgtorg.by

**Лот № 1** располагается на земельном участке с кадастровым № 340100000005000194, площадь 0,5575 га, целевое назначение – для содержания и обслуживания здания многофункционального, гаража, АЗС. Право постоянного пользования. А также на земельном участке с кадастровым № 340100000005007723, площадь 0,0322 га, целевое назначение – для содержания и обслуживания здания проходной. Право постоянного пользования. **Лот № 2** располагается на земельном участке с кадастровым № 221855300001000833, площадь 1,2540, целевое назначение – земельный участок для использования под производственные базы. Категория земель – земли населенных пунктов, садоводческих товариществ и дачного строительства. Право постоянного пользования. **Лот № 3** расположен на земельном участке с кадастровым № 223850100001002330, предоставленном на праве постоянного пользования, площадью 0,3223 га, целевое назначение – для содержания и обслуживания здания общежития. Право постоянного пользования. **Лот № 4** располагается на земельном участке с кадастровым № 500000000002001514, площадь 0,0844 га, целевое назначение – для содержания и обслуживания административного здания по адресу: город Минск, улица Промышленная, 14. Право постоянного пользования. **Лот № 5** располагается на двух земельных участках: 1. Земельный участок с кадастровым № 500000000002001391, площадь 2,0913 га, целевое назначение – для эксплуатации и обслуживания производственных зданий и сооружений. Категория земель – земли населенных пунктов, садоводческих товариществ и дачного строительства. Право постоянного пользования. Земельный участок имеет обременения: охранная зона линий связи – площадь 0,0118 га; охранная зона магистральных трубопроводов – площадь 0,1360 га; охранная зона магистральных трубопроводов – площадь 0,3750 га. 2. Земельный участок с кадастровым № 500000000002001392, площадь 0,0282 га, целевое назначение – эксплуатация и обслуживание производственных зданий и сооружений. Право постоянного пользования. Земельный участок имеет обременения: земли, находящиеся в охранных зонах линий связи и радиофикации – площадь 0,0282 га. **Лот 5 располагается на территории СЭЗ «Минск»**

*В отношении имущества, входящего в Лот 1, имеется залог ОАО «БПС-Сбербанк». В отношении Лотов 1, 5 имеется обременение в виде аренды*

**УСЛОВИЯ**

В случае признания аукциона несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе, участник может приобрести Предмет (Предметы) торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе и он согласен приобрести Предмет (Предметы) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Предмета (Предметов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Предмета (Предметов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

**Вознаграждение аукциониста по Лотам 1–4 – 5 % от конечной цены предмета торгов, складывающейся в ходе торгов. Вознаграждение аукциониста по Лоту 5 – 1,5 % от конечной цены предмета торгов, складывающейся в ходе торгов.**

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Начало приема заявлений в 10.00 01.06.2020 г.**
**Окончание приема заявлений в 16.00 15.06.2020 г.**
**по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121**

**Аукцион состоится 16.06.2020 в 12.00 (регистрация участников с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте **https://orgtorg.by/info/**

До подачи заявления необходимо внести задаток
на **р/с BY36ALFA30122215570040270000**
в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X,
УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера».

Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Управление механизации № 88» (Лот №__), проводимом __.__.2020 г.»

**Срок внесения задатка: с 10.00 01.06.2020 г. по 16.00 15.06.2020 г.**

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Контактное лицо для вопросов по участиям в торгах: +375 29 308 28 97, Анаида.

Контактное лицо для осмотра Объектов: 80293295179, Юрий Анатольевич (г. Гомель), 8044 712 91 42, Михаил Александрович (г. Минск), +375 29 310 90 85, Дмитрий.

По вопросам наличия обременений на вышеуказанные лоты обращаться по телефону +375 29 310 90 85, Дмитрий.

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

Государственная регистрация договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера»:**<br>**☎ 8 (029) 305 86 50 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by**<br>**• сайт https://orgtorg.by**<br>**(220113, Республика Беларусь, г. Минск, улица Мележа, д. 1, офис 1121 )** |
| **Продавец** | **ОАО «Управление механизации № 88»**<br>**(220075, г. Минск, ул. Промышленная, 23)**<br>**в лице антикризисного управляющего ООО «ПрофДМ»**<br>**☎ 8 (017) 395-81-34, 8 (017) 395-89-17, 8 (029) 392-89-06** |

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ

**Организатор электронных торгов (продавец):** Михановичский сельский исполнительный комитет, Минская область, Минский район, аг. Михановичи, пер. Садовый, 8, тел.: (017) 545 10 25, 503 71 67, 545 10 23, 510 62 13, тел. моб.: 8 (029) 165 98 22, 8 (029) 559 28 62.

**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Торги проводятся 26.06.2020 г.** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by**

**Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

| № лота | Местонахождение земельного участка; кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура* | Начальная цена лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Сумма затрат на организацию и проведение торгов, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, аг. Чуриловичи, У-24; **№ 623684206601000384** | 0,1474 | Электроснабжение. Подключение к инженерным коммуникациям возможно после получения технических условий в соответствующих специализированных организациях | 30 000,00 | 3 000,00 | 1 797,92 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 2 | Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, аг. Чуриловичи, У-26; **№ 623684206601000385** | 0,1500 | Электроснабжение. Подключение к инженерным коммуникациям возможно после получения технических условий в соответствующих специализированных организациях | 30 000,00 | 3 000,00 | 1 797,92 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 3 | Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, аг. Чуриловичи, У-22; **№ 623684206601000381** | 0,1456 | Электроснабжение. Подключение к инженерным коммуникациям возможно после получения технических условий в соответствующих специализированных организациях | 30 000,00 | 3 000,00 | 1 797,92 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 4 | Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, аг. Чуриловичи, У-22; **№ 623684206601000382** | 0,1438 | В населенном пункте имеются сети электроснабжения, газоснабжения и связи. Подключение к инженерным коммуникациям возможно после получения технических условий в соответствующих специализированных организациях, подъезд к участку осуществляется с улицы местного значения | 30 000,00 | 3 000,00 | 1 797,92 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 5 | Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Березина, земельный участок № 4; **№ 623684200601000074** | 0,1500 | Имеется возможность подключения к сетям электроснабжения, подъезд к участку осуществляется с улицы местного значения. В настоящее время ведется проектирование и строительство газопровода за счет собственных средств граждан (кооператив по газификации). Подключение к инженерным коммуникациям возможно после получения технических условий в соответствующих специализированных организациях | 14 000,00 | 1 400,00 | 1 103,99 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 6 | Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Березина, земельный участок № 3; **№ 62368420060100073** | 0,1500 | | 14 000,00 | 1 400,00 | 1 143,60 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 7 | Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Березина, участок № 1; **№ 623684200601000071** | 0,1500 | | 14 000,00 | 1 400,00 | 1 162,60 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 8 | Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Серафимово, ул. Восточная; **№ 623684206101000231** | 0,1405 | Свет, газ, вода, подъезд к участку имеется | 20 000,00 | 2 000,00 | 325,30 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 9 | Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Алексеевка, объект № 21-2017/М; **№ 623684200101000220** | 0,1379 | Свет, газ, подъезд к участку имеется | 23 168,00 | 2 317,00 | 1732,15 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 10 | Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Алексеевка, объект № 26-2017/М; **№ 623684200101000213** | 0,1227 | Свет, газ, подъезд к участку имеется | 20 614,00 | 2 061,00 | 1732,15 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 11 | Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Алексеевка, объект № 6-2017/М; **№ 623684200101000214** | 0,1423 | Свет, газ, подъезд к участку имеется | 23 906,00 | 2 391,00 | 1732,15 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 12 | Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Алексеевка, объект № 25-2017/М; **№ 623684200101000215** | 0,1285 | Свет, газ, подъезд к участку имеется | 21 588,00 | 2 159,00 | 1732,15 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |

** В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, которые имеются в данном населенном пункте. Подключение к указанным коммуникациям возможно <u>только в соответствии с техническими условиями</u> на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями. Возмещение затрат на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участка осуществляется на основании решения Минского районного исполнительного комитета от 22 октября 2018 г. № 5195.*

**Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами** – **22.06.2020 г. до 15.00**.

**Задаток** для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Срок внесения задатка** – не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах. **Назначение платежа**: внесение суммы задатка для участия в электронных торгах рег. № ___ по заявлению № ___.

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов;

возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) за земельный участок, продаваемый в частную собственность, или за право заключения договора аренды земельного участка.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, местный исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола.

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

## ДЫСЦЫПЛІНАВАНЫМ БАЦЬКАМ — ПАСКОРАНАЕ АФАРМЛЕННЕ ДАВЕДАК

**У Беларусі зарэгістравана 3600 дзяцей са станоўчым тэстам на COVID-19. Пры гэтым 95 % з іх пераносяць інфекцыю амаль бессімптомна. Пра гэта падчас брыфінгу расказала галоўны спецыяліст аддзела медыцынскай дапамогі маці і дзецям Міністэрства аховы здароўя Таццяна БУРДЗЬ.**

— Невялікая колькасць дзяцей мае сярэднецяжкі стан. Як правіла, гэта дзеці са спадарожнай паталогіяй — анкагематалагічнымі захворваннямі, атлусценнем. Цяжкіх выпадкаў у нас не было, — заўважыла спецыяліст.

Яна расказала, што ў Беларусі нарадзілася 62 здаровыя дзіцяці, у тым ліку дзве пары двайнят, ад маці, інфіцыраваных каранавірусам.



Фота Алены ДАЎЖАНОК.

Усяго за чатыры месяцы ў Беларусі нарадзілася 22 631 дзіця — на 7 % менш, чым год таму. Пры гэтым кожны пяты жыхар Беларусі — дзіця.

Па структуры дзіцячай захваральнасці наша краіна не адрозніваецца ад іншых. На першым месцы знаходзяцца захворванні органаў дыхання — яны займаюць больш за 60 %. На другім — хваробы органаў зроку. На трэцім — апорна-рухальнай сістэмы, у тым ліку траўматызацыя. Чацвёртае месца займаюць захворванні стрававальнай сістэмы.

— На жаль, мы назіраем рост цукровага дыябету і атлусцення ў дзяцей, — адзначыла Таццяна Бурдзь. — Каля 17 % школьнікаў маюць лішнюю вагу, і гэтая лічба з году ў год павялічваецца.

Медыцынскую дапамогу дзецям у Беларусі аказваюць у шасці дзіцячых абласных бальніцах, дзевяці гарадскіх бальніцах у Мінску, 45 перынатальных цэнтрах, 39 дыспансерах, 10 РНПЦ, тры з якіх — дзіцячыя. Акрамя таго, у краіне функцыянуе 310 педыятрычных аддзяленняў амаль ва ўсіх населеных пунктах.

У сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй спрошчана выдача медыцынскіх даведак для наведвання дзіцячага садка, паступлення ў школу ці вышэйшую навучальную ўстанову.

— Цяпер не абавязкова наведваць усіх спецыялістаў. Калі бацькі былі дысцыплінаваныя і праходзілі дыспансерызацыю цягам года, яны атрымаюць даведку паскорана па выніках дыспансерызацыі. Акрамя таго, у нас з'явілася сістэма анлайн-заказаў, што таксама спросціць атрыманне дакументацыі. Для праходжання медаглядаў вылучаны спецыяльныя час, патокі здаровых і хворых пацыентаў у паліклініках таксама падзелены, — паведаміла Таццяна Бурдзь.

Сітуацыя

# Назіраецца некаторая стабілізацыя, асабліва сярод падлеткаў

**Эпідсітуацыя, звязаная з пандэміяй каранавіруса ў свеце, паўплывала на распаўсюджанне наркотыкаў у нашай краіне. У сувязі з часовым закрыццём граніц з суседнімі і іншымі дзяржавамі, нелегальнае паступленне наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў знізілася. Інтэрнэт-магазіны ў выніку рэалізуюць іх меншымі дозамі за большыя грошы, а таксама перакупляюць адзін у аднаго. У выніку з пачатку года захоўваецца дынаміка скарачэння нарказлачынстваў на 30 %. Пры гэтым, па ацэначных звестках, колькасць асоб, уцягнутых у наркаманію, складае каля 88 тысяч чалавек.**

## КОЛЬКАСЦЬ НАРКАЗЛАЧЫНСТВАЎ ЗМЯНШАЕЦЦА

Наркотыкі па-ранейшаму распаўсюджваюцца пераважна бескантактным спосабам — пры дапамозе закладак, а рэклама «працуе» ў розных месенджарах і сацыяльных сетках.

— Статыстыка сведчыць пра пэўную стабілізацыю наркасітуацыі ў краіне. Амаль на палову менш выяўлена злачынстваў з удзелам непаўналетніх. Устаноўлена 14 падлеткаў, якія іх здзейснілі. Сярод іх зніжаецца і колькасць передазіровак: за чатыры месяцы гэтага года ўстаноўлены толькі адзін такі факт. Апошні выпадак смерці непаўналетняга ад наркотыкаў зарэгістраваны ў краіне ў 2014 годзе, — расказвае **начальнік галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі Міністэрства ўнутраных спраў Алег СІЛЬВЕСТРОВІЧ.**

Змяншаецца і колькасць нарказлачынстваў, учыненых раней судзімымі. Але, нягледзячы на стабілізацыю сітуацыі, наркапагрозы ў краіне захоўваюцца. Пра гэта, у прыватнасці, сведчыць колькасць передазіровак. Летась іх лічба вырасла на 16,5 %, зафіксавана 381 такі выпадак. Назіраецца і павелічэнне колькасці передазіровак, якія заканчваюцца смерцю. Больш чым у палове выпадкаў гэта адбывалася ў выніку злоўжывання метадонам. У першым квартале гэтага года колькасць передазіровак працягвала расці, зафіксавана 127 такіх фактаў.

— Мы аналізуем кожны выпадак передазіроўкі. Відавочна, што наркаспажыўцы не паспяваюць за змяненнем кан'юнктуры наркарынку. У кожнага свая гранічная доза, якая не прывядзе да передазіроўкі і смерці. Аднак наркаспажыўцы не ўлічваюць той факт, што апошнім часам на беларускі рынак паступае больш чысты метадон, таму передазіроўкі здараюцца часцей, — тлумачыць Алег Сільвестровіч.

Пры гэтам суразмоўца падкрэслівае, што доля смерцяў ад передазіроўкі, прычынай якіх паслужыў менавіта метадон, павялічылася з 50 % да 70 %. Ва ўсіх выпадках наркотык набываўся бескантактным спосабам з выкарыстаннем інтэрнэту.

«Партрэт» загінулых у выніку передазіроўкі такі: гэта асобы ва ўзросце ад 30 да 38 гадоў, нарказалежныя са стажам, раней судзімыя (у тым ліку па артыкуле 328 Крымінальнага кодэкса), якія стаялі на ўліку ва ўрача-нарколага і накіроўваліся на прымусовае лячэнне. Разам з тым каля паловы памерлых мелі шэраг спадарожных хвароб, якія паўплывалі на смяротны зыход.

Сёлета праваахоўнікі выявілі 13 памяшканняў, спецыяльна абсталяваных для вырошчвання наркаўтрымліваючых раслін. Паколькі асноўнай крыніцай наркотыкаў на нашым рынку застаюцца нелегальныя пастаўкі з-за мяжы, у 2020 годзе выяўлена і ліквідавана 14 каналаў паставак, а таксама іх транзітных перавозак. Накіравана патрабаванне аб абмежаванні доступу да 198 сайтаў, спынена дзейнасць шасці інтэрнэт-магазінаў.

МУС удзельнічае ў распрацоўцы сайта kids.pomogut.by, які плануецца ўкараніць у адукацыйны працэс па ўсёй краіне, далучылася да праекта прадстаўніцтва дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі, які датычыцца бяспекі дзяцей у інтэрнэце і прадугледжвае правядзенне серыі вэбінараў для дзяцей розных узростаў і бацькоў. Таксама вядзецца стварэнне цэнтраў прафілактыкі: ужо працуюць цэнтр наглядней прафілактыкі ў Брэсце і кабінет прафілактыкі наркаманіі ў Віцебску. Арганізацыя падобных антынаркатычных пляцовак запланавана па ўсёй краіне.

## ЗАДАЧА — ДАПАМАГЧЫ

Пры гэтым, нягледзячы на неспрыяльную эпідэміялагічную сітуацыю з-за распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі, аказанне амбулаторнай і стацыянарнай дапамогі нарказалежным у Беларусі не перапынялася. Пра гэта паведаміў **галоўны ўрач Мінскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя-наркалогія» Аляксей АЛЯКСАНДРАЎ.** У краіне функцыянуе сем аддзяленняў для лячэння нарказалежных на 270 месцаў.

— Мы адаптаваліся і ў адрозненне ад іншых краін працягваем дапамагаць нашым пацыентам. У нас не зафіксавана ніводнага выпадку, калі аказанне дапамогі прывяло да інфіцыравання каранавірусам. За чатыры месяцы гэтага года ў нас навват крыху павялічылася колькасць людзей, якія звяртаюцца па медыцынскую дапамогу. Адна з прычын — закрыццё граніц і тое, што наркотыкаў на нашым рынку стала меней, — адзначае Аляксей Аляксандраў.

Калі ў пачатку года колькасць пацыентаў, якія атрымлівалі метадонавую дапамогу, складала 690, то сёння іх ужо 750 па ўсёй краіне. Гэта таксама адна з мер прафілактыкі передазіровак нелегальным метадонам.

— Мы адрэагавалі і на сітуацыю з амністыяй, бо разумеем: калі мы не прапануем адэкватную дапамогу, гэтыя людзі вернуцца да наркаспажывання. Таму з 1 студзеня мы спрасцілі атрыманне медыцынскай, псіхалагічнай, сацыяльнай дапамогі асобам, якія вызваліліся з месцаў пазбаўлення волі. Напрыклад, калі ў чалавека няма пашпарта, але ёсць дакумент аб спыненні выканання пакарання, ён ідзе на першачарговы прыём без чаргі. Другая катэгорыя, на якую мы звярнулі ўвагу, — гэта жанчыны. Наркаспажыванне адбіваецца не толькі на іх, але і на іх дзецях і блізкіх. Таму разам з грамадскімі арганізацыямі мы запусцілі праект дапамогі нарказалежным жанчынам, які прадугледжвае іх суправаджэнне спецыялістамі ад моманту цяжарнасці да паўналецця іх дзяцей, — расказвае медык.

## ТАКАЯ ПРАГРАМА — АДЗІНАЕ ВЫЙСЦЕ

**Намеснік галоўнага ўрача па амбулаторным раздзеле работы Гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансера г. Мінска Жанна ІСТОМІНА** паведаміла, што ў Мінску пад назіраннем медыкаў знаходзіцца каля 5 тысяч чалавек, у тым ліку 3 тысячы з іх маюць залежнасць. Дыспансер аказвае ім усе віды дапамогі, тут працуюць тры праграмы рэабілітацыі. Адна з іх, «Вясёлка», — для тых, хто жадае прайсці лячэнне ананімна. Яно ў такім выпадку платнае. Для пацыентаў, што знаходзяцца на дыспансерным уліку, распрацаваны праграмы рэабілітацыі «Крок» і «Формула жыцця». Акрамя таго, працуе і праграма замяшчальнай метадонавай тэрапіі.

— У Мінску нашы кабінеты размешчаны па 15 адрасах. Не ўсім мясцовым жыхарам падабаецца суседства з імі. Так, нашы пацыенты часам вельмі шумныя. Але людзі чамусьці думаюць, што яны небяспечныя. Мы атрымліваем скаргі, што яны нібыта раскідваюць шпрыцы, здзяйсняюць правапарушэнні. Гэта часта не пацвярджаецца. Насамрэч для нашых пацыентаў названая праграма — адзінае выйсце. На сёння ў ёй 176 чалавек. Яны працуюць, ствараюць сем'і, у іх нараджаюцца дзеці. Такі праект — вялікі ўнёсак у зніжэнне шкоды. Напрыклад, у нас 80 чалавек з ВІЧ. Дзякуючы праграме яны атрымліваюць не толькі метадонавую тэрапію, але і антырэтравірусную, што дазваляе не перайсці ў стадыю захворвання, — аргументуе Жанна Істоміна.

Лячэнне дазваляе пазбавіцца ад нарказалежнасці і пражыць даволі доўгае жыццё. На сёння аднаму з найстарэйшых былых нарказалежных з працяглым стажам 70 гадоў. Ён жыве ў Светлагорску, горадзе, які пасля распаду СССР стаў адным з эпіцэнтраў распаўсюджвання наркотыкаў. Мужчыну ўдалося справіцца з залежнасцю, ён стварыў сям'ю, а сёння мае ўнукаў і нават праўнука.



**ООО «Центр Белинвентаризация»**
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**

- ✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком
- ✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
- ✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА
## УПП «Гомельский завод торгового оборудования», 8 (044) 720 62 83

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | - Капитальное строение (цех нетканых материалов) с инв. № 350/С-88113 общей площадью 7931,0 кв. м (составные части и принадлежности: подвал, одна металлическая пристройка, шесть кирпичных пристроек, три холодные кирпичные пристройки, крыльцо, три навеса, трансформаторная подстанция, две градирни, два пожарных резервуара, проезжая часть, трое ворот, три забора), трансформатор 630, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Текстильная, 10/2.<br>- Капитальное строение (здание КНС) с инв. № 350/С-88083 общей площадью 37,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Текстильная, 10/3.<br>Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 340100000004001219 площадью 2,2543 га.<br>- Капитальное строение (проходная) с инв. № 350/С-88081 общей площадью 113,0 кв. м (составные части и принадлежности: крыльцо), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Текстильная, 10/1.<br>Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000004001297 площадью 0,0215 га.<br>- Канализационная сеть с инв. № 350/С-153087, протяженностью 682,7 м, расположенная по адресу: г. Гомель, канализационная сеть от КК1 до КК34 на территории ЧПУП «Гомельский завод торгового оборудования» по ул. Текстильной, 10 | **244 152,00** | **24 415,20** |
| 2 | Капитальное строение (здание склада) с инв. № 350/С-88110 общей площадью 1 459,0 кв. м (составные части и принадлежности: кирпичная пристройка, рампа, сходы), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Текстильная, 10/4.<br>Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000004001217 площадью 0,3063 га | **80 000,00** | **8 000,00** |
